16+

Літ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 2 (5211) 13 студзеня 2023 г.

ISSN 0024-4686

Мова праз тоўшчу стагоддзяў стар. 4—5

Залацінкі творчасці майстра стар. 10

Роздум аб ціхім прыстанку стар. 13

Даніна традыцыям

Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка ўручае ўзнагароду дырэктару Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Аляксандру Лакотку.

«Прэміі, якія штогод уручаем у гэтыя зімовыя дні, — даніна спаконвечным традыцыям, якія злучаюць эпохі і пакаленні. Даніна духоўнай сіле беларусаў — мудрых, працалюбівых, такіх, якія любяць родную зямлю і шануюць продкаў», — заявіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падчас цырымоніі ўручэння прэміі «За духоўнае адраджэнне», а таксама спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва, якая адбылася ў аўторак, 10 студзеня, у Палацы Рэспублікі. Асаблівы акцэнт Прэзідэнт зрабіў на важнасці і надзвычайнай актуальнасці прэміі ў сённяшні неспакойны час. «Сваімі духоўнымі, творчымі і прафесійнымі дасягненнямі вы ствараеце будучыню нашай Беларусі. Шчыра ганаруся вамі і ад усёй душы ўдзячны за вашу працу», — падкрэсліў Кіраўнік дзяржавы.

Уладальнікі ўзнагароды «За духоўнае адраджэнне» былі вызначаны яшчэ напярэдадні Новага года. У спіс лаўрэатаў, апроч іншых, увайшлі аўтарскі калектыў у складзе Васіля Баранчука, дырэктара Духоўна-асветніцкага цэнтра прыхода храма ў гонар прападобнамучаніцы вялікай княгіні Елісаветы ў Бабруйску, і настаяцеля прыхода гэтага храма протаіерэя Віктара Толаха, а таксама калектыў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук. Спецыяльныя прэміі атрымалі аўтарскія і народныя творчыя калектывы, калектывы музейных устаноў, творчых майстэрань ды іншыя дзеячы з усёй краіны.

«ЛіМ»-акцэнты

Пашана. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ і распараджэнне, у адпаведнасці з якімі работнікі СМІ і сферы культуры ўдастоены медалёў і Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Медаля Францыска Скарыны ўдастоены начальнік аддзела па асвятленні дзейнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Беларускага тэлеграфнага агенцтва Уладзімір Мацвееў, загадчык аддзела навін культуры галоўнай дырэкцыі «Агенцтва тэлевізійных навін» Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Міхаіл Равуцкі, саліст Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча Андрэй Коласаў, а таксама галоўны рэжысёр Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Ганна Маторная і саліст — вядучы майстар сцэны тэатра Дзмітрый Шабеця.

• Падзякі Прэзідэнта ўдастоены трое супрацоўнікаў галоўнай дырэкцыі «Агенцтва тэлевізійных навін» Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі: загадчыца аддзела рэпарцёраў Настасся Бенедзісюк, намеснік загадчыка аддзела палітычных аглядальнікаў Ілона Красуцкая і загадчыца аддзела выпуску Ірына Якаўлева. Акрамя таго, Падзякай Прэзідэнта адзначаны заслугі намесніка дырэктара дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» Святланы Кнутавай і дырэктара дырэкцыі ранішняга вяшчання гэтага тэлеканала Таццяны Рудакоўскай, начальніка аддзела падтрымкі і развіцця інтэрнэт-рэсурсаў Беларускага тэлеграфнага агенцтва Наталлі Ярэміч, начальніка аддзела па радыёвяшчанні «Альфа Радыё» выдавецкага дома «Беларусь сегодня» Вадзіма Шэпета, загадчыка аддзела дызайну камп'ютарнай графікі дырэкцыі тэлевытворчасці ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» Дзмітрыя Галоўчыца.

Праект. Стартаваў прыём работ на III рэспубліканскі літаратурны стартап *LitUP*, арганізаваны Міністэрствам інфармацыі, гаворыцца на сайце ведамства. Асноўная мэта ініцыятывы — пошук, падтрымка і прасоўванне перспектыўных беларускіх аўтараў і праектаў. Асаблівасць стартапа ў тым, што ўдзел могуць прыняць як знакамітыя аўтары з багатай бібліяграфіяй, так і пачаткоўцы. Работы на першы этап конкурсу прымаюцца да 24 лютага на электронную пошту *projects.zviazda@gmail.com*, паштовым адпраўленнем або непасрэдна на адрас Саюза пісьменнікаў Беларусі. Намінацыі конкурсу: паэзія, проза, дзіцячая літаратура, літаратура для падлеткаў, нон-фікшн. Фінал конкурсу адбудзецца ў рамках XXX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Пераможцы атрымаюць прыярытэтнае права на выданне сваёй кнігі ў выдавецтвах краіны тыражом да 1000 экз.

Выстаўка. Богаслужэбнае адзенне, панагіі і рукапіс Мітрапаліта Філарэта (Вахрамеева), першага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, Героя Беларусі, прадстаўлены на выстаўцы, якая працуе ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага, інфармуе БелТА. Праект з'яўляецца часткай дзяржаўнай праграмы, што прадугледжвае ўвекавечанне памяці пра ўладыку Філарэта. На выстаўцы прадстаўлены панагіі — частка архіерэйскага адзення з выявай Госпада Ісуса Хрыста, Багародзіцы або святых. Сярод экспанатаў — падараная ўладыку Філарэту на 50-годдзе панагія, дзе адлюстраваны два святыя: роўнаапостальны Кірыл і праведны Філарэт Міласцівы. Ёсць і сярэбраная — «Спас Нерукатворны». Наведвальнікі могуць убачыць таксама кнігу ганаровых гасцей, у якой пакінулі запісы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, Святейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій II, іерархі праваслаўнай царквы і хрысціянскіх канфесій, прадстаўнікі дзяржаўнай улады, навуковай і творчай інтэлігенцыі. Выстаўка будзе адкрыта да 10 лютага.

• Кніжныя рарытэты, фотаальбомы, даведнікі ў ілюстрацыях, турыстычныя буклеты прадставілі ў Нацыянальнай бібліятэцы на выстаўцы «Жамчужыны беларускай прыроды» да Сусветнага дня запаведнікаў і нацыянальных паркаў, паведамляе БелТА. Экспазіцыя складаецца з 9 тэматычных раздзелаў: «Прыродныя тэрыторыі Беларусі пад аховай», «Нацыянальныя паркі Беларусі. Белавежская пушча», «Па запаведных мясцінах. Бярэзінскі біясферны запаведнік» і іншых. Між тым прадстаўлены сапраўдны рарытэт — трэці том выдання «Жывапісная Расія», які выйшаў у 1882 годзе. Тут размешчаны артыкулы, напісаныя спецыяльна для гэтага выдання гісторыкам і этнографам А. Кіркорам на аснове матэрыялаў, сабраных ім у экспедыцыях у 1840—1850-я гады. Да ліку ўнікальных экспанатаў адносяць выданне «Белавежская пушча» (1894), якое мае арыгінальны падзагаловак «Накіды пяром і фатаграфіяй». Кніга змяшчае артыкул пра Белавежскую пушчу і 40 фатаграфій Вішнякова з маляўнічымі краявідамі самага старажытнага запаведніка Еўропы. Работа экспазіцыі прадоўжыцца да 5 чэрвеня.

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Гатоўнасць падтрымаць

Пісьменнікі рыхтуюцца да XXX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, якая пачне сваю работу ў сталіцы Беларусі 22 сакавіка. Пра тое, якім будзе іх удзел у традыцыйным свяце кнігі, ішла размова ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі. На сустрэчу завіталі намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар Бузоўскі і часовы павераны Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Рахматула Назараў.

Мяркуецца, што Узбекістан возьме ўдзел у выстаўцы ў якасці краіны — цэнтральнага экспанента. Адпаведна і кніжны стэнд будзе болей прадстаўнічым, і склад нацыянальнай дэлегацыі з Узбекістана атрымаецца большым.

— Мы былі б рады падтрымаць Узбекістан у правядзенні мерапрыемстваў па праграме выстаўкі і Дзён узбекскай літаратуры ў Беларусі. Гатовы ўсямерна спрыяць рэалізацыі такой ініцыятывы, — заўважыў на сустрэчы старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч.

У беларускага і ўзбекскага бакоў шмат агульнага, шмат кропак судакранання. Такую думку выказаў Ігар Бузоўскі, засяродзіўшы ўвагу на коласаўскай тэме.

— Я быў ва Узбекістане зусім нядаўна і бачыў, з якой пашанотай там згадваюць імя народнага песняра Беларусі Якуба Коласа. Ведаю, што ў снежні Ташкент наведалі беларускія пісьменнікі — дэлегацыя СПБ складала пяць чалавек. Спадзяюся, што з'явіліся новыя ініцыятывы, наладжаны кантакты, — адзначыў намеснік міністра інфармацыі.

Удзел у сустрэчы ўзяла і першы намеснік старшыні СПБ Алена Стэльмах. Яна, у прыватнасці, расказала пра выданне анталогій твораў сучаснай літаратуры краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў, пра гатоўнасць арганізатараў гэтага праекта прэзентаваць ужо выдадзенае на кніжным форуме ў Мінску.

Сяргей ШЫЧКО

ініцыятывы

На роднай мове

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі адбылася перадача невялікай бібліятэкі твораў членаў грамадскага аб'яднання ў фонды Нацыянальнай бібліятэкі Узбекістана імя Алішэра Наваі.

Падарунак прыняў Часовы Павераны Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Рахматула Назараў. У падборку ўвайшлі кнігі сучасных паэтаў і празаікаў — Тамары Красновай-Гусачэнкі, Алеся Кажадуба, Івана Сабілы, Юрыя Іванова, які не так даўно пайшоў з жыцця, Анатоля Аўруціна, Людмілы Кебіч, іншых аўтараў. Дадзеныя выданні пабачылі свет у серыі выдавецтва «Харвест» — «Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі».

— Спадзяюся, што гэтыя кнігі стануць асновай фарміравання беларускага аддзела ў сценах Нацыянальнай бібліятэкі Узбекістана імя Алішэра Наваі, — зазначыў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч, перадаючы падборку ўзбекскаму дыпламату. Ён падкрэсліў, што важна, каб творы беларускіх калег убачылі ўзбекскія пісьменнікі, перакладчыкі, даследчыкі літаратурных сувязей і проста чытачы, якія хацелі б ведаць, як развіваецца сучасная літаратура ў Беларусі.

— Будзем разлічваць, што рух будзе двухбаковым — і ў найбліжэйшы час свае кнігі на рускай мове, а, можа быць, і на ўзбекскай у Беларусь перададуць пісьменнікі з Ташкента, — заўважыў Рахматула Назараў. — Так прадстаўнікі нашай дыяспары будуць ведаць, дзе ў Беларусі можна знайсці кнігі на роднай мове.

Мікола БЕРЛЕЖ

імпрэзы

Музычныя карціны

У сталічным кінатэатры «Цэнтральны» гледачам прапанавалі «новы погляд на сусветна вядомыя шэдэўры класічнай музыкі». У сераду, 11 студзеня, тут прайшоў чарговы паказ з серыі «Класіка *HD*» — «Святло месяца ў кіно». Праграму кінасеанса склалі канцэртныя запісы вядомых музычных кампазіцый, прысвечаных начной пары. Неўміручая класіка такіх мэтраў, як Бетховен, Вівальдзі, Бах, прагучала ў выкананні налейпшых аркестраў свету пад кіраўніцтвам самых яркіх дырыжораў сучаснасці, кожны з якіх вылучаецца характарам і майстэрствам.

Варта адразу агаварыцца: творы тыя ў сценах мінскіх ілюзіёнаў гучаць не ўпершыню. Прэм'ера карціны «Святло месяца ў кіно» адбылася яшчэ ў лістападзе мінулага года ў адным з кінатэатраў *Silver Screen*. Тое, што фільм паспяхова працягвае свае гастролі па сталіцы, лішні раз пераконвае: відовішча варта ўвагі. Сакрэт поспеху праекта можа заключацца ў тым, што перад намі не проста канцэртны рэпартаж, а паўнавартасны канцэртны фільм альбо, кажучы тэрмінамі савецкага кіназнаўства, фільм-канцэрт. Камера не проста «фіксуе» — яна лунае паміж выканаўцамі, зазіраючы ім у твары, назіраючы за іх рухамі, нават нырае ўнутр інструментаў, каб паказаць нараджэнне чароўных гукаў.

За падрыхтоўку карціны дзякаваць трэба Тэатру класічнай музыкі «Імпрэсія» на чале з Марыяй Бандарэнкай і Арцёмам Шаплыкам. Пры стварэнні падобных фільмаў-канцэртаў аб'яднанне не абмяжоўваецца сродкамі адной толькі музыкі. Так, «Святло месяца ў кіно», нароўні з іншымі праектамі творчай суполкі, не баіцца цытаваць літаратуру, прапаноўваць жывапіснае прачытанне нот. У сувязі з гэтым слова «карціна» ў дачыненні да азначанага аўдыёвізуальнага твора ўяўляецца вельмі дарэчным. «Вечныя пытанні і адказы, што бударажаць, — у музыцы, жывапісе, прозе…» — даводзіць анатацыя кінастужкі.

Каміла НАВІНКІНА

конкурсы

Летапісцы свайго краю

Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі і Брэсцкі абласны краязнаўчы музей аб'яўляюць краязнаўчы конкурс «Берасцейскія пісьменнікі — летапісцы роднага краю». Ён праводзіцца з мэтай прыцягнення ўвагі грамадскасці да краязнаўчай дзейнасці, якую ажыццяўляюць айчынныя літаратары, услаўлення малой радзімы праз развіццё літаратурнага і гістарычнага краязнаўства, папулярызацыі творчасці пісьменнікаў вобласці, выяўлення і падтрымкі таленавітых аўтараў.

Да ўдзелу прымаюцца крытычныя работы на беларускай або рускай мовах, у якіх паказана, як пісьменнікі Берасцейшчыны адлюстроўваюць у сваёй творчасці малую радзіму і яе гістарычае мінулае. Аб'ём твораў — 10—12 тысяч знакаў.

Удзельнічаць могуць не толькі прафесійныя навукоўцы і пісьменнікі, але і аматары ў трох узроставых групах: навучэнцы 10—11 класаў школ, каледжаў, ліцэяў, гімназій; студэнты ВНУ; дарослыя.

Работы, набраныя на камп'ютары, прымаюцца на разгляд з 1 лютага да 31 сакавіка Брэсцкім абласным аддзяленнем СПБ па электроннай пошце: *tatiana.demidovich@gmail.com* (з пазнакай: на конкурс «Пісьменнікі — летапісцы»). У заяўцы канкурсанты паведамляюць прозвішча, імя, імя па бацьку, год нараджэння, хатні адрас, кантактны тэлефон.

Пераможцы (лаўрэаты) конкурсу будуць узнагароджаны дыпломамі і падарункамі ад Саюза пісьменнікаў Беларусі. Урачыстае падвядзенне вынікаў і ўганараванне пераможцаў (лаўрэатаў) адбудзецца 18 красавіка, у Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных мясцін.

Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі

анонсы

У прыярытэце — дзіцячы чытач

Якія кніжныя навінкі пабачаць свет у найбліжэйшы час у Выдавецкім доме «Звязда»? Адказ на гэтае пытанне, відавочна, важны для чытача і пакупніка, як, дарэчы, і для саміх аўтараў. А сёння, калі параўноўваць з савецкім часам, у кнігарнях не знойдзеш тэматычных перспектыўных планаў ніводнага выдавецтва. Таму важны характар носіць анансаваная інфармацыя пра кніжныя навінкі.

У лютым — на пачатку сакавіка 2023 года «Звязда» прапануе некалькі выданняў, работа над падрыхтоўкай якіх ідзе ў кніжнай групе выдавецтва. Будзе завершана выданне серыі кніг доктара біялагічных навук Анатоля Федарука «Старинные усадьбы Гродненщины». У апошнім томе — расповед пра сядзібы Смаргонскага і Шчучынскага раёнаў. Параўнальна нядаўна ў «Звяздзе» выйшаў том, прысвечаны Свіслацкаму і Слонімскаму раёнам. Ён ужо займеў увагу чытачоў. Амаль палова тыражу за некалькі месяцаў рэалізавана. Выданне можна набыць у кнігарнях ААТ «Белкніга» і мінскай краме «Акадэмкніга». Хацелася б параіць кнігі дасведчанага спецыяліста ў галіне сядзібна-паркавага мастацтва настаўнікам гісторыі, геаграфіі, біялогіі і краязнаўцам.

Юнаму чытачу прапануе зборнік апавяданняў «Чудогода» вядомы пісьменнік Валерый Кастручын. Творы вопытнага мастака слова вылучаюцца назіральнасцю, у асноўным прысвечаны прыродзе. Піша Валерый Кастручын з любоўю да навакольнага асяроддзя, з трывогай за лёс прыроды. Чытаеш яго апавяданні — і згадваеш кнігі Уладзіміра Дубоўкі, Янкі Маўра, Віталія Біянкі, Віталя Вольскага, Георгія Скрабіцкага, Міхаіла Прышвіна, іншых рускіх і беларускіх пісьменнікаў-прыродазнаўцаў.

Ірыну Карнаухаву юны чытач таксама палюбіў. У апошнія гады выйшла некалькі яе кніг, дзе рэчаіснасць спалучаецца з казачнымі прыгодамі юных герояў. Так яно адбываецца і ў творы «Дверной дом», напісаным у жанры фэнтэзі. Выданне ў хуткім часе пабачыць свет. Зборнік казак «Суп з чарапахі» прапануе самым маленькім вядомы беларускі пісьменнік Сяргей Давідовіч.

Падрыхтавана да друку і кніга казак Генадзя Аўласенкі «Як сем сыноў лесніка чорта перахітрылі». Празаік з Чэрвеня фактычна адкрыў жанр — тапанімічная казка. І новы зборнік не першая яго кніга ў гэтым кірунку.

Па просьбе бібліятэкараў і школьнага настаўніцтва ў «Звяздзе» вырашылі перавыдаць добра вядомую кнігу Леаніда Прокшы — «Незвычайныя прыгоды хлопчыка Бульбінкі». Гэтая аповесць-казка добра вядома розным пакаленням беларускіх хлопчыкаў і дзяўчынак.

У найбліжэйшых кнігавыдавецкіх планах — новыя кнігі Таццяны Дземідовіч, Валянціны Быстрымовіч, Марыны Помаз-Лайковай, Міхася Пазнякова.

Пабачыць свет у лютым і раман Людмілы Рублеўскай «Авантуры Пранціша Вырвіча, маршалка менскага», якім пісьменніца завяршае свой гістарычны цыкл. Раней у «Звяздзе» пабачылі свет шэсць кніг з серыі твораў пра Пранціша Вырвіча.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

да ведама

Інтарэс навукоўцы

Навуковыя дысертацыі па творах сучасных беларускіх аўтараў, на жаль, зараз з'ява даволі рэдкая. І тым больш ухваляецца ініцыятыва прыхільнікаў айчыннай літаратуры да больш усебаковага вывучэння літаратурнага працэсу і яго стваральнікаў.

Людміла Іконнікава прадстаўляе Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь. У полі яе зроку — творчасць Георгія Марчука, якую навукоўца разглядае з пункту гледжання жанрава-стылёвых пошукаў пісьменніка. Пра значнасць постаці аўтара, які заявіў аб сабе ў другой палове XX стагоддзя, сведчыць як яго багатая літаратурная спадчына, што знайшла ўвасабленне ў розных літаратурных кірунках: прозе, драматургіі, дзіцячай літаратуры, — так і інтарэс да яго твораў з боку навукоўцаў, літаратурных крытыкаў.

Яны падкрэсліваюць уласцівыя Г. Марчуку пошукі ўласнага месца ў свеце, ідэнтыфікацыі сябе са сваім родам, нацыяй, складанымі перыпетыямі існавання народа на зломах часу. Добра распрацаваныя сюжэты яго твораў прыцягваюць увагу чытача, а схільнасць да філасофскай заглыбленасці і псіхалагічнай дакладнасці ў паказе характару выклікаюць роздум і глыбокі аналіз жыццёвых з'яў, што спрыяе росту цікавасці з боку чытача і гледача.

— Нягледзячы на імкненне навукоўцаў і крытыкаў прааналізаваць створанае пісьменнікам, раскрыць ідэйна-тэматычную праблематыку напісанага ім, паказаць шырыню жанрава-тэматычнага дыяпазону, некаторыя стылёвыя адзнакі асобных твораў і цыклаў, спадчына літаратара не даследуецца як мастацкая сістэма, — даводзіць Людміла Іконнікава.

Гэтым і тлумачыцца старанная вывучэнне Людмілай Іконнікавай асноўных дамінант, якія фарміравалі асобу і стыль пісьменніка. Створанай дысертацыяй яна прэтэндуе на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

Марыя ЛІПЕНЬ

на развітанне

Клапаціўся аб нацыянальным

Беларуская культурная супольнасць смуткуе... 7 студзеня 2023 года сышоў з жыцця заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, уладальнік спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, былы дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа (1997—2012), артыст драмы, вядучы майстар сцэны Рыгор Іванавіч Шацько.



Рыгор Шацько нарадзіўся 16 красавіка 1959 года ў вёсцы Ракаў Валожынскага раёна Мінскай вобласці. У 1984 годзе закончыў акцёрскае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. З 1 жніўня 1984 года пачаў працаваць артыстам Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа.

Рыгор Іванавіч быў таленавітым акцёрам шырокага творчага дыяпазону. З 1998 года — вядучы майстар сцэны. Вызначаўся высокім прафесіяналізмам, сцэнічнай абаяльнасцю, працавітасцю, творчай ініцыятывай. Яму быў падуладны самы разнастайны ролевы матэрыял.

Найбольш значныя вобразы створаны Рагорам Шацько ў класічным рэпертуары: Аляксандр Залатнікоў («Ах, які пасаж!» У. Салагуба і П. Фёдарава), Тыбальт («Рамэа і Джульета» У. Шэкспіра), Грэгар («Рэцэпт Макропуласа» К. Чапека)… Вялікай папулярнасцю ў гледачоў карысталіся ролі ў спектаклях сучасных аўтараў: Лысы, Курчавы («Энергічныя людзі» В. Шукшына), Марашаль («Будзьце здаровы!» П. Шэно), Дзмітрый («Плюшавая малпа ў дзіцячым ложку» М. Яблонскай), Госць («Шчаслівае здарэнне» С. Мрожака) і іншыя. Выдатнымі творчымі работамі ўзбагаціў Р. І. Шацько свой акцёрскі багаж у спектаклях па творах беларускай драматургіі: Драгун («Парог» А. Дударава), Панас («І смех, і грэх» Л. Родзевіча, У. Галубка), Пятрук («Залёты» В. Дуніна-Марцінкевіча)...

З лістапада 1997 года да красавіка 2012 года Рыгор Шацько працаваў на пасадзе дырэктара тэатра. Па яго ініцыятыве і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства культуры на акцёрскім факультэце Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў завочна рыхтаваліся маладыя спецыялісты для работы ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа. Да сённяшняга часу пошуку маладых талентаў садзейнічае гарадскі конкурс «Сцэнічныя чытанні "Школьны тэатр"», які пачаў праводзіцца на базе тэатра з 1997 года пры непасрэдным удзеле дырэктара.

Менавіта падчас кіравання Рыгора Іванавіча, у 2001 годзе, Беларускі дзяржаўны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа займеў высокі статус «Нацыянальны».

У гэты перыяд трупа пастаянна выязджала на абменныя гастролі ў Бранск, Маскву, Смаленск, Арол, Санкт-Пецярбург, Яраслаўль (Расія), Адэсу, Львоў (Украіна), Бостан, Нью-Ёрк (ЗША), было наладжана супрацоўніцтва з Польшчай. Тэатр імя Якуба Коласа прымаў удзел у Днях беларускай культуры ў Парыжы і Мурманску. Было арганізавана актыўнае абслугоўванне сельскага гледача Віцебскай вобласці, гарадоў Полацка, Наваполацка, Оршы.

Пасля сыходу з пасады дырэктара Рыгор Шацько працягваў актыўна працаваць на сцэне.

Алесь ЗАМКОЎСКІ

«ЛіМ»-люстэрка

Саюз мастакоў Беларусі ўдзельнічае ў прысвечанай 100-годдзю СССР выстаўцы ў Новай Траццякоўцы ў Маскве, піша БелТА. У праекце ўдзельнічаюць мастакі двух творчых саюзаў — Беларускага саюза мастакоў і Саюза мастакоў Расіі. Экспазіцыя аб'ядноўвае каля 400 станковых твораў жывапісу, скульптуры і графікі. Гэта жывапісныя палотны мастакоў савецкай эпохі І. Грабара, А. Дэйнекі, А. Самахвалава, С. Герасімава і іншых, скульптурныя творы М. Манізера, Л. Кербеля, А. Сотнікава, В. Думаняна, графічныя працы Кукрыніксаў, А. Какорына, А. Пахомава, В. Курдава, Д. Мітрохіна і іншых. Гэта ўжо другі паказ беларускіх мастакоў у Новай Траццякоўцы. Першы адбыўся летась у рамках Дзён культуры Рэспублікі Беларусь у Маскве.

Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр з 11 да 15 студзеня знаходзіцца на гастролях у Туле. У рамках праекта «Стары Новы год з Музычным тэатрам» паказваюць музычную камедыю «Нявеста з Імярэціі» Г. Канчэлі, фарс «Добры дзень, я цётка Чарлі!..» О. Фельцмана, шоу-канцэрт для дзяцей і дарослых «Навагодняя перазамарозка», мюзікл «Тры мушкецёры» М. Дунаеўскага і музычнае шоу «Кінахіт». У гэты ж час Тульскі акадэмічны тэатр драмы выступае ў Мінску на сцэне Музычнага тэатра. У праграме тэатра — спектаклі «Лэдзі Макбет Мцэнскага павета», «Прытворны хворы» Мальера, «Канёк-гарбунок» Пятра Яршова і іншыя, гаворыцца на сайце Беларускага музычнага.

У Брэсце прайшоў XXXV Міжнародны фестываль класічнай музыкі «Студзеньскія музычныя вечары». У форуме прынялі ўдзел выканаўцы з Беларусі, Балгарыі, Босніі і Герцагавіны, Грузіі, Італіі, Расіі, Сербіі і Сірыі. «35 гадоў гэты творчы форум збірае музыкантаў сусветнага ўзроўню і маладых таленавітых выканаўцаў, знаёміць шырокую публіку з найлепшымі ўзорамі айчыннага і сусветнага музычнага мастацтва, служыць прызнанай творчай пляцоўкай для ўмацавання прафесійных і чалавечых кантактаў. З кожным годам гэтае свята класічнага мастацтва прымнажае свае традыцыі, выконваючы важную місію папулярызацыі найлепшых узораў высокай культуры», — адзначыў міністр культуры Беларусі Анатоль Маркевіч.

Супрацоўнікі мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» плануюць рэалізаваць у 2023 годзе больш за дзесяць сумесных з расійскімі музеямі выставачных праектаў. Ужо ў студзені ў Музеі абароны будзе экспанавацца фотадакументальная выстаўка з фондаў мемарыяльнага Музея абароны і блакады Ленінграда, прысвечаная 80-годдзю прарыву блакады і пракладзенай па лёдзе Ладажскага возера «Дарозе жыцця». На люты ў мемарыяльным комплексе сумесна з Цэнтральным музеем Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гадоў — Музеем Перамогі рыхтуюць мультымедыйную выстаўку да 80-годдзя разгрому нямецка-фашысцкіх войскаў пад Сталінградам. На ёй, у прыватнасці, будуць прадстаўлены матэрыялы аб вайскоўцах Брэсцкага гарнізона — удзельніках Сталінградскай бітвы.

Сёння ў Вялікай канцэртнай зале Белдзяржфілармоніі адбудзецца канцэрт «Шэдэўры сусветнага арганнага мастацтва», дзе выступіць Хірока Іноўэ (Японія — Расія). «Хірока Іноўэ — таленавіты музыкант, які канцэртуе па ўсім свеце, і яркая прадстаўніца новага пакалення акадэмічных выканаўцаў, якая чуйна рэагуе на трывогі і праблемы сённяшняга дня і служыць сваім мастацтвам высокім эстэтычным прынцыпам, ідэям гуманізму і талерантнасці», — адзначаюць арганізатары канцэрта. Беларускія слухачы знаёмы з творчасцю гэтай салісткі. Яе ўдзел у зімовых канцэртах стаў добрай традыцыяй для многіх аматараў арганнага гучання. У праграмах Хірока Іноўэ ўвесь час гучаць творы рускіх кампазітараў, паколькі менавіта гэтай краіне арганістка прысвяціла сваё прафесійнае жыццё.

Вялікі тэатр Беларусі ў студзені — лютым чакае ў госці артыстаў, якіх ужо паспела палюбіць беларуская публіка. Так, 21 студзеня ў партыі Радамеса ў оперы Джузепе Вердзі «Аіда» на беларускую сцэну выйдзе заслужаны артыст Расіі, саліст Маскоўскага тэатра «Новая Опера» імя Я. Колабава, запрошаны саліст Вялікага тэатра Расіі Міхаіл Губскі. За дырыжорскім пультам у гэты вечар — галоўны дырыжор Башкірскага тэатра оперы і балета народны артыст Рэспублікі Башкартастан Арцём Макараў. Яшчэ адзін госць тэатра — заслужаны артыст Рэспублікі Буратыя, саліст Новасібірскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета, запрошаны саліст «Новай Оперы» (Масква) і Вялікага тэатра Расіі, лаўрэат расійскай нацыянальнай прэміі «Залатая маска» Міхаіл Пірагоў. 28 лютага спявак выступіць у новай ролі — Германа ў драме Пятра Чайкоўскага «Пікавая дама». Дырыжыраваць будзе таксама Арцём Макараў, удакладняе БелТА.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Арганічна валодаць

Па ініцыятыве Саюза пісьменнікаў Беларусі не так даўно ў Мемарыяльнай зале Дома літаратараў адбылося пасяджэнне круглага стала «Мова пісьменніка», у якім узялі ўдзел літаратары і навукоўцы. Адкрываючы мерапрыемства, дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі Ігар Капылоў акрэсліў кола найбольш актуальных на сёння пытанняў і вызначыў такім чынам кірунак размовы. Да ўвагі чытача — вытрымкі з найбольш адметных выступленняў.

Ігар Капылоў: «Мова пісьменніка — неабсяжная тэма, якая выклікае пастаянны інтарэс у прадстаўнікоў розных сфер гуманітарных і сацыяльных ведаў. Вучоных-літаратуразнаўцаў цікавяць моўныя сродкі, якія

Вераніка Курцова і Ігар Капылоў.

ўжывае пісьменнік для стварэння вобраза, перадачы характару, унутранага свету героя, яго светабачання і светаадчування, апісання прыроды. Вучоныя-мовазнаўцы даследуюць мову пісьменніка як крыніцу ўзбагачэння лексічнай сістэмы мовы. Вучоныя-філосафы імкнуцца зразумець узаемасувязь паміж мовай і мысленнем. У школьных і ўніверсітэцкіх курсах маcтацкія творы выкарыстоўваюцца як дзейны сродак навучання мовам, крыніца папаўнення лексічнага запасу навучэнцаў і засваення імі граматычных і стылістычных асаблівасцей мовы.

Паняцце мова пісьменніка цесна звязана з паняццем “літаратурная мова”. Пры гэтым неабходна памятаць, што літаратурная мова — гэта апрацаваная форма агульнанароднай мовы, якая валодае пісьмова замацаванымі нормамі. З аднаго боку, норма як агульнапрынятая сістэма правіл стрымлівае моўную стыхію. З другога боку, ці зможа пісьменнік рэалізаваць сваю творчую задуму, калі ён пастаянна будзе думаць пра тое, каб не выйсці за межы нормы. А калі і выйсці, то як захаваць тое пачуццё меры, якое не дазволіць творцу разбураць моўную сістэму? Разам з тым неабходна разумець, што норма — гэта ў пэўнай ступені ўмоўнасць. Пад уплывам розных лінгвістычных і экстралінгвістычных фактараў нормы могуць мяняцца. Як сведчаць гістарычныя факты, менавіта пісьменнікі аказвалі вялікі ўплыў як на фарміраванне нормаў літаратурнай мовы, так і на іх дынаміку.

Калі глядзець на праблему мовы пісьменніка з дзяржаўных пазіцый, неабходна разумець, што пісьменнік, літаратура і мова — тры важныя складнікі, ад якіх залежаць фарміраванне нацыянальнай свядомасці і станаўленне нацыі, дзяржаўнасці, пытанне гуманітарнай і дзяржаўнай бяспекі. Як прыклад можна прывесці XIX стагоддзе — вельмі няпросты перыяд у нашай гісторыі, які характарызаваўся адсутнасцю дзяржаўнасці і нацыянальна-культурным заняпадам. Менавіта мастацкая літаратура адыграла ў гэты час выключна важную ролю ў тым, што беларуская мова пачала ўсведамляцца як сродак кансалідацыі грамадства і нацыянальнага адраджэння. Паказальна, што ў гэтым працэсе вылучыліся пісьменнікі, выхаваныя на традыцыях рускай і польскай культур, але якія ўсвядомілі, што нацыянальная мова з’яўляецца не толькі сімвалам культурнага жыцця, але і палітычнага існавання народа і нацыі. Фарміраванне літаратурнай мовы адбывалася на аснове народных гаворак. Гэты працэс напачатку меў стыхійны характар. Ужыванне лексічных або граматычных сродкаў часта залежала ад таго, носьбітам якога дыялекту быў пісьменнік або ад правіл, якіх прытрымлівалася выдавецтва. На працягу XIX стагоддзя было апублікавана на беларускай мове ўсяго 75 кніг. Беларуская мова заставалася неўнармаванай і некадыфікаванай, не мела распрацаванай навуковай тэрміналогіі і кніжна-пісьмовых стыляў. Больш плённым быў пачатак XX стагоддзя. З 1906 да 1915 года выходзіла штотыднёвая грамадска-палітычная, літаратурна-мастацкая, навукова-папулярная газета “Наша Ніва”, на старонках якой друкаваліся выдатныя майстры мастацкага слова — Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Алесь Гарун, Цётка, Канстанцыя Буйло, Змітрок Бядуля, Максім Гарэцкі. Менавіта ў гэты перыяд беларускае слова прайшло апрацоўку ў творчасці пісьменнікаў і ўзнялося да ўзроўню літаратурнай мовы нацыі.

Адметным для развіцця мовы быў пасляваенны перыяд, які характарызуецца актыўным развіццём буйных літаратурных жанраў, у першую чаргу рамана. Менавіта мова чатырох пасляваенных дзесяцігоддзяў была ўзята за аснову пры ўкладанні “Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы” ў 5 тамах. Гэты слоўнік утрымлівае больш за 97 тысяч лексічных адзінак. У свой час ён знайшоў шырокае выкарыстанне ў моўнай практыцы. Але з выхаду першага тома слоўніка прайшло больш за 40 гадоў. На сучасным этапе ўзнікла вострая неабходнасць у падрыхтоўцы новага акадэмічнага слоўніка. У Інстытуце мовазнаўства зараз вядзецца работа над тлумачальным слоўнікам, аб’ём якога складзе больш за 250 тысяч слоў. Новы “Тлумачальны слоўнік беларускай мовы” будзе адлюстроўваць тыя зрухі ў лексічным складзе беларускай мовы, што адбыліся ў ёй, пачынаючы ад нашаніўскай пары і да нашых дзён. Базай слоўніка паслужылі не толькі мастацкія творы, але ў значнай ступені і публіцыстычныя. Такая ўвага да публіцыстыкі абумоўлена ў першую чаргу тым, што ў адрозненне ад сярэдзіны XX стагоддзя, калі вядучая роля ў развіцці беларускай літаратурнай мовы заставалася за мовай мастацкіх твораў, на сучасным этапе нормы ў значнай ступені фарміруюцца пад уздзеяннем мовы сродкаў масавай інфармацыі.

***Навум Гальпяровіч**, паэт, публіцыст, аўтар і вядучы многіх праграм на канале «Культура» Беларускага радыё:* «У сваёй публіцыстычнай дзейнасці даводзілася сустракацца з многімі мовазнаўцамі, якія сталі героямі маіх праграм, але ці адкажам мы сёння на пытанне, што такое мова сучаснага пісьменніка і адкуль ён чэрпае моўныя сродкі, інавацыі, адкуль у яго з’яўляюцца новыя словы? Дубоўка, напрыклад, уводзіў неалагізмы, што станавіліся літаратурнымі, але цяпер гэта цяжэй. На што сёння арыентуюцца маладыя пісьменнікі? Глыбокая, арганічная вясковая мова знікае… Вёска перастала быць крыніцай яе напаўнення. Гарадскія пісьменнікі чэрпаюць лексіку са слэнга гаворак і запазычанняў — у выніку атрымліваецца мова, якая не была ўласціва пісьменнікам XX стагоддзя…

Ёсць пытанне, ці з’яўляецца беларускай мовай трасянка. І якая трасянка: што ўзнікла на аснове беларускіх народных слоў ці сапсаванай рускай мовы? Трасянку ў сваіх творах пісьменнікі ўжываюць…

Што тычыцца мовы СМІ і камунікацыі, тут цяжка гаварыць аб яе літаратурным складніку. Мовазнаўцы павінны вучыць радыё- і тэлекарэспандэнтаў правільнаму маўленню. Мова СМІ патрабуе ўдасканальвання, і тут, мне бачыцца, станоўчую ролю адыграў бы большы ўплыў вучоных на яе чысціню і багацце. Толькі тады яна магла б стаць лексічным папаўненнем літаратурнай.

Часткова рэалізаваць гэтую мэту можна было б і з дапамогай водгукаў на кнігі, што друкуюцца ў літаратурных выданнях. Аўтары допісаў вельмі рэдка звяртаюць увагу на тое, наколькі багатая мова пісьменніка. Мовазнаўцы і літаратуразнаўцы маглі б больш удзельнічаць у літаратурным працэсе.

Мы на канале “Культура” Беларускага радыё гаворым пра пісьменнікаў, у якіх багатая мова, і стараемся паказаць яе глыбіню ў творах Віктара Карамазава, Вячаслава Адамчыка, Казіміра Камейшы і іншых. Гэта тое, на што трэба арыентавацца. Калі мовазнаўца разбярэ гэтыя залацінкі і пакажа, наколькі багатая мова ў пісьменніка, маладому пакаленню будзе на чым вучыцца…

І тут узнікае пытанне: што для чалавека матчына мова і як ён да яе прыйшоў, як да яе ставіцца і якое месца яна займае ў яго жыцці. Кожны павінен ведаць, якая мова гучыць сёння з вуснаў людзей — хто, як не пісьменнікі і навукоўцы, павінны быць прыкладам, эталонам развіцця мовы?

Вельмі важная і рэдактарская работа з тэкстам. На аснове багацця мовы дапамагчы пісьменніку знайсці лепшы выраз — вось прынцып работы рэдактара з аўтарам, таму супрацоўнік рэдакцыі павінен быць абазнаны ў мове…»

***Віктар Праўдзін**, празаік:* «Мы, пісьменнікі і вучоныя, цяпер у той сітуацыі, калі нам трэба вучыцца адно ў аднаго. Я, напрыклад, быў бы рады, калі б мовазнаўцы стварылі слоўнік, якім можна пастаянна карыстацца падчас напісання твораў, і часцей публікавалі б навукова-папулярныя артыкулы пра мову мастацкай літаратуры, на якія можна было б арыентавацца. Артыкулы, якія выходзяць з-пад пяра гэтых вучоных, павінны быць даступнымі для ўсіх без выключэння чытачоў, хто зацікаўлены ў тым, каб павысіць свой узровень валодання мовай. Сённяшні час вымагае кансалідацыі паміж носьбітамі беларускага слова: усе ў сацыякультурнай прасторы, каму неабыякавы лёс роднай мовы, павінны шчыльна супрацоўнічаць».

***Валянціна Русак**, загадчык аддзела сучаснай беларускай мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі:* «У артыкуле Якуба Коласа “Развіваць і ўзбагачаць літаратурную мову” (1950) ёсць проста залатыя словы, на якія неабходна звярнуць увагу: “Наша літаратурная мова знаходзіцца ў працэсе тварэння. Тварэц мовы — народ. Задача ж пісьменніка — у фарміраванні, адборы найлепшага, у прывядзенні мовы да літаратурных норм. Як бачым, задача немалая. Мы павінны мець мову прыгожую, гучную, простую, але гнуткую і выразную”. Колас звяртаў увагу на тое, што “толькі сумеснымі намаганнямі пісьменнікаў як непасрэдных стваральнікаў мовы, і вучоных, якія распрацоўваюць мову навукова, савецкай інтэлігенцыі, якая карыстаецца мовай, пашырае яе, мы здолеем узняць нашу мову на высокую ступень, што будзе адпавядаць узроўню нашай вялікай эпохі”.

У прыведзеных выказваннях выяўляецца канцэпцыя развіцця і ўзбагачэння мовы, а менавіта тое, што гэта грамадскі працэс, у якім задзейнічаны, па сутнасці, увесь народ — стваральнік мовы: пісьменнікі фарміруюць літаратурную мову шляхам адбору найлепшага, а задача вучоных — навукова апрацоўваць мову і кадыфікаваць яе. Апрацаваную навукоўцамі мову выкладчыкі нясуць у аўдыторыі. Такім чынам устанаўліваюцца пераемнасць і ўзаемадзеянне».

***Вераніка Курцова**, загадчык аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі:* «Так, глыбокі знаўца народнай мовы Якуб Колас звяртаў увагу на тое, што, перш чым уводзіць слова чужое ці навастворанае, трэба “пашарыць у кішэнях сваёй памяці”, гэта

Алена Пісарэнка і Валянціна Русак.

значыць, у скарбах беларускай народнай мовы. Сёння літаратурная мова адлюстроўвае ў сваіх слоўніках тое, што ўжываюць пісьменнікі ў творчай працы. Адпаведна, калі мы не будзем выкарыстоўваць дыялекты,

мовай...

Ніна Сянкевіч і Алена Боганева.

то пазбавім літаратурную мову вялікага нацыянальнага багацця».

***Валянціна Мароз**, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі беларускай мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі:* «Паняцце культуры мовы арыентавана на нормы, якія

Валянціна Мароз.

выпрацоўваюцца ў практыцы і замацоўваюцца ў даведніках і слоўніках. Культура мовы вызначаецца па крытэрыях арыентацыі на ўстаялую норму правілаў. Тут можна прымяніць прынцып: гэта правільна, добра, але вось гэта — лепш. Прынцып "добра і лепш" якраз і з'яўляецца крытэрыем адбору і ацэнкі моўных з'яў у творчасці таго ці іншага літаратара ці спецыяліста ў беларускай мове. Калі ісці ад пытання пра ролю мастацкай літаратуры ў развіцці літаратурнай мовы, хацелася б звярнуць увагу на тое, што мы, беларусы, у сваёй гісторыі ўжо ў XIV—XV стагоддзях мелі літаратурна-пісьмовую форму мовы, якая была шматфункцыянальнай, арыентаванай на тую ролю, якую ў любы гістарычны перыяд выконвае літаратурная ўнармаваная мова: яна ахоплівала ўсю тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага — ад Балтыйскага мора да Чорнага. Функцыя мовы як аб'яднальнага фактару і цяпер працуе на кансалідацыю нацыі — у гэтым яе сутнаснае значэнне…

У нас ёсць гістарычны слоўнік беларускай мовы ў 37 выпусках, дзе абагульнены слоўны запас мовы ад XIV да XVIII стагоддзя ўключна — тое, што з'яўляецца нашым маяратам на ўсе наступныя часы.

Сёння беларуская мова развіваецца як нацыянальная ў дзвюх формах: літаратурнай і народна-дыялектнай. Прычым літаратурная вызначаецца як узорная, апрацаваная майстрамі слова, мова літаратуры і навукі. У гэтым плане і ў сістэме адукацыі, і ў сістэме творчага развіцця асобы вельмі важнае значэнне маюць аўтарытэтныя ў літаратуры асобы, класікі. Некаторыя з іх спалучалі талент пісьменніка і мовазнаўцы, напрыклад, як Фёдар Янкоўскі. Ён увёў у мовазнаўчую практыку лінгвістычны тэрмін "гаваркія словы", якія не проста называюць з'явы свету, а даюць станоўчую ці адмоўную характарыстыку: патрэбнік — непатрэбнік, штукар — назола, мілоснік — пустадомак, кніжнік — цёмнік.

Адкуль з'яўляецца пісьменнік? Вядома ж, не з космасу. Талент развіваецца ў спрыяльных і затухае ў неспрыяльных умовах. Ці быў бы ў нас Янка Купала, калі б ім не апекаваўся прафесар Браніслаў Эпімах-Шыпіла? Так і сучасныя пісьменнікі ўзрастаюць на ніве адукацыі, удасканальваюць свой талент праз самаадукацыю, набываюць творчы вопыт у кантактах з людзьмі».

***Алена Пісарэнка (Багамолава)**, загадчык кафедры беларускай і замежнай філалогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, паэтка:* «Вярнуўшыся да гутаркі пра культуру мовы, хацелася б нагадаць, што гаворка ідзе не толькі пра нарматыўнасць мовы — паняцце гэта больш шырокае, тут шмат іншых складнікаў: лагічнасць, дарэчнасць, дакладнасць, багацце і разнастайнасць маўлення і экспрэсіўнасць — якасць, якая найбольш праяўляецца ў стылі мастацкай літаратуры і дазваляе аўтару падтрымліваць увагу чытача. Доўгі час лічылася, што яна забяспечваецца толькі вобразнымі сродкамі мовы лексічнага і сінтаксічнага ўзроўню. Сёння даказалі, што ёсць і іншыя сродкі стварэння экспрэсіўнасці мастацкага стылю. Кожны ўзровень мовы мае сваю сістэму сродкаў выразнасці, якія працуюць на тое, каб прыцягнуць увагу чытача і прымусіць задумацца над вобразам. Гэтым і фарміруецца культура маўлення — праз яго выразнасць. Наколькі ж багатая ў гэтым плане мова мастацкай літаратуры! Напрыклад, у "Слоўніку эпітэтаў" у слова "сонца" 166 эпітэтаў!

У літаратурных творах могуць быць элементы дыялектнай і прастамоўнай лексікі, калі ідзе стылізацыя, калі гэта апраўдана маўленчай сітуацыяй. Адпаведныя рэплікі ёсць і ў Мележа, і ў Пташнікава, і ў Дударава. Гэтыя словы стылізуюць маўленне персанажа і ствараюць нацыянальны каларыт».

***Алена Боганева**, загадчык сектара этналінгвістыкі і фальклору Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі:* «Спецыфіка нашай работы такая, што мы шмат ездзім па сёлах збіраць фальклорны матэрыял. На жаль, у навучанні гарадскіх дзяцей няма фальклорнага складніка. Між тым у вёсках фальклор да сённяшняга дня з'яўляецца жывой спадчынай, у кожнай экспедыцыі, якія ў нас ладзяцца па некалькі разоў на год у розныя куткі Беларусі, мы запісваем казкі, легенды, паданні, якія па-сапраўднаму ўражваюць сваёй багатай вобразнасцю, разнастайнасцю варыянтаў, незвычайнымі і часам нечаканымі паваротамі сюжэта. Усе запісы мы расшыфроўваем і публікуем з захаваннем дыялектаў. Так, з 2002 да 2013-га была выдадзена серыя з 10 кніг "Традыцыйная мастацкая культура беларусаў" па гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі.

Уклад пісьменнікаў у папулярызацыю фальклорнай спадчыны цяжка пераацаніць: Янка Купала, Якуб Колас, Кузьма Чорны, Уладзімір Караткевіч і многія іншыя творцы шырока выкарыстоўвалі народнае дыялектнае маўленне, матывы і вобразы беларускай народнай культуры. Увогуле, тэматыка "Фальклор і нацыянальная літаратура" магла б разглядацца на мэтавым мерапрыемстве (круглы стол, семінар, навукова-практычная канферэнцыя і г. д.)».

Віктар Праўдзін і Навум Гальпяровіч.

***Алена Васілевіч**, загадчык аддзела выданняў і тэксталогіі Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі:* «За апошняе дзесяцігоддзе супрацоўнікі нашага аддзела прымалі ўдзел у падрыхтоўцы Збораў твораў Якуба Коласа ў 20 тамах, Івана Шамякіна ў 23 тамах і Янкі Брыля ў 10 тамах. Тэксталагічнае даследаванне і зверка тэкстаў з усімі даступнымі крыніцамі істотныя і цікавыя найперш таму, што заўжды відаць, як пісьменнік працаваў са словам. Безумоўна, мова ўсіх пісьменнікаў розная. Мяне асабіста ўразіла, наколькі ашчадна і цярпліва працаваў са словам Янка Брыль. Калі ён рыхтаваў твор да выдання, то праглядаў усё, што ў яго маецца датычна гэтага твора. Так, зазвычай па кожным творы ў яго было сабрана безліч папак з самымі рознымі матэрыяламі і дакументамі. Гэта ўнікальны выпадак сярод пісьменнікаў. Іван Антонавіч рабіў праўкі непасрэдна перад здачай у выдавецтва і пасля таго, як выходзіў зборнік, праглядаў і правіў наноў, а ў сваім літаратурным завяшчанні папрасіў улічыць яго праўкі, заўвагі і прапановы, калі будзе рыхтавацца Збор твораў…»

***Ніна Сянкевіч**, навуковы супрацоўнік аддзела славістыкі і тэорыі мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі:* «Сучасная беларуская літаратурная мова пачала фарміравацца ў XIX стагоддзі як мова мастацкай літаратуры. Менавіта на гэтым этапе роля асобы пісьменніка была найвялікшай. Літаратурная дзейнасць не была масавай. Толькі адзінкавыя аўтары ствараліі мастацкія творы, і ў кожным з іх прасочвалася сувязь з гаворкай, якой валодаў пісьменнік. Унёсак тагачасных майстроў слова ў працэс станаўлення літаратурнай мовы можна вызначыць праз усебаковы аналіз мовы іх твораў. Аднак да гэтага часу такі аналіз не быў праведзены. Дый наогул XIX стагоддзе з'яўляецца найменш даследаваным перыядам у гісторыі беларускай мовы, што можна патлумачыць недаступнасцю тэкстаў літаратурных твораў. Як вядома, у другой палове XIX стагоддзя было забаронена ўжыванне беларускай мовы і выданне беларускамоўных кніг. У выніку творы часта перадаваліся вусна, многія засталіся ў рукапісах, іншыя зніклі, і шанцаў знайсці іх амаль не засталося.

Найлепшым інструментам даследавання мовы пісьменніка з'яўляецца слоўнік мовы яго твораў. Складанне такога слоўніка — гэта працаёмкі працэс. Так, "Слоўнік мовы Янкі Купалы" ствараўся цэлым калектывам на працягу 30 гадоў. А ўсяго мы маем толькі чатыры адпаведныя даведнікі: слоўнікі мовы Францыска Скарыны, Янкі Купалы, Якуба Коласа (некаторыя аспекты), Максіма Багдановіча. Дапамагчы ў гэтай справе могуць камп'ютарныя тэхналогіі, якія дазваляюць апрацоўваць вялікія масівы тэкстаў. Зручнай формай прадстаўлення вынікаў такой апрацоўкі з'яўляецца канкарданс — даведнік, дзе пералічаны ўсе без выключэння словы тэксту разам з іх адрасамі, частотамі і тэкставымі ілюстрацыямі. У 1985 годзе такі даведнік быў створаны ў нашым інстытуце на базе корпуса, які ўключаў 283 аўтэнтычныя тэксты літаратурных твораў, напісаных на беларускай мове ў XIX стагоддзі. Канкарданс у машыннай раздрукоўцы займаў 12 тамоў вялікага фармату. Зразумела, што папяровае выданне такога даведніка было нерэальным. Калі стала магчымым выдаць яго ў электронным варыянце, выявілася, што за гэтыя некалькі дзесяцігоддзяў даследчыкі знайшлі шмат новых твораў, якія заставаліся ў архівах. Быў створаны новы корпус, які павялічыўся амаль удвая — 515 тэкстаў, і на яго базе новы канкарданс. Даведнік быў выдадзены ў 2015 годзе. Ён змяшчае яшчэ і асобныя аўтарскія канкардансы тых пісьменнікаў, якія зрабілі найбольшы ўнёсак у развіццё літаратурнай мовы: Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Францішка Багушэвіча, Яна Чачота, Аляксандра Ельскага, Янкі Лучыны, Адама Гурыновіча, Каруся Каганца.

Канкарданс можна выкарыстоўваць як базу для стварэння іншых лексікаграфічных даведнікаў, а таксама як самастойны інструмент для даследавання беларускай мовы. Ён дазваляе прасачыць гісторыю з'яўлення слова ў літаратурнай мове: хто першы ўжыў тое ці іншае слова, у чыіх яшчэ творах яно сустракаецца, прааналізаваць лексіку з пункту гледжання семантыкі».

Былі і іншыя цікавыя выступленні навукоўцаў, якія расказвалі пра свае даследаванні літаратурнай мовы і разважалі пра сучаныя асаблівасці яе функцыянавання. Так, **Вячаслаў Мартысюк**, малодшы навуковы супрацоўнік сектара камп'ютарнай лінгвістыкі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі падзяліўся досведам па фарміраванні электроннай базы літаратурных тэкстаў перыяду 1918—1941 гадоў. Пэўныя думкі пра стан сучаснай лінгвістыкі выказаў і **Уладзімір Кошчанка**, загадчык сектара камп'ютарнай лінгвістыкі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

У рабоце круглага стала прынялі ўдзел студэнты літаратурнага гуртка «БУКет» пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў **Андрэй Балкоўскі, Паліна Шут** і **Кацярына Мяркулава**. Маладыя літаратары прыйшлі, каб пачуць пра вопыт сталых калег, пра задачы, якія ставяцца перад сучасным пісьменнікам падчас работы з літаратурным словам, пра магчымыя крыніцы ўзбагачэння слоўнікавага запасу і фарміравання эстэтычнага густу. Яны выказалі шчырыя словы падзякі за магчымасць узяць удзел у пасяджэнні, за набыццё адпаведных ведаў і спадзяванне на далейшае супрацоўніцтва.

У выніку пасяджэння круглага стала «Мова пісьменніка» было вызначана кола найбольш важных праблем для далейшых абмеркаванняў падчас сустрэч пісьменнікаў і навукоўцаў на розных дыялогавых пляцоўках з мэтай развіцця літаратурнай мовы і пашырэння сферы яе ўжывання і ўплыву.

Матэрыял падрыхтавалі
Наталля ЯКАВЕНКА і Аліса БРАТКА
Фота Кастуся ДРОБАВА

пленум СПБ

Асэнсаванае чытанне — аснова адукаванасці

На Пленуме Саюза пісьменнікаў Беларусі па пытаннях дзіцячай літаратуры прагучала шмат цікавых думак і прапаноў. Чытачы нашай газеты ўжо мелі магчымасць пазнаёміцца з двума пленарнымі дакладамі. Аднак былі і іншыя паведамленні, што прыцягнулі ўвагу прысутных і выклікалі шырокі розгалас. Сярод іх — выступленне начальніка ўпраўлення маніторынгу якасці адукацыі, старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі гуманітарнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Вячаслава КАРАТКЕВІЧА.

Цяжка ўявіць адукаванага чалавека, які не прывучаны чытаць. Без чытання няма адукацыі, фарміравання светапогляду, прафесійнага станаўлення, эмацыянальнага і інтэлектуальнага развіцця. Яно ахоплівае ўсе сферы і этапы сацыялізацыі асобы і ў многім вызначае жыццёвую паспяховасць.

Разам з тым як часта ад настаўнікаў і бацькоў можна пачуць, што падлеткі не жадаюць чытаць! Сапраўды, сёння ва ўсім свеце назіраецца крызіс чытання. У справаздачы арганізацыі *Worldreader* за 2019 год адзначаецца, што больш за 250 млн дзяцей ва ўсім свеце не маюць базавых навыкаў пісьменнасці і рызыкуюць назаўсёды застацца на гэтым узроўні; больш за палову дзяцей, якія жывуць у краінах з нізкім і сярэднім узроўнем даходаў, да 10 гадоў не ўмеюць чытаць; 115 млн маладых людзей ва ўсім свеце і больш за 50 % моладзі ў краінах Афрыкі і на поўдзень ад Сахары непісьменныя. Там жа адзначаецца, што цяжка пераацаніць сёння патэнцыяльныя магчымасці чытання: «Гэта як турбанагнятальнік для ўсяго астатняга развіцця чалавецтва: адукацыі, роўнасці ў адносінах да здароўя, сацыяльнай справядлівасці, росквіту, самастойнасці, нават спачування. <…> Чытачы будуюць лепшы свет».

Фота Кастуся Дробава.

Вячаслаў Караткевіч.

Нягледзячы на гэта, цікавасць да чытання ў свеце няўхільна зніжаецца. Паводле даследавання *World Culture Score Index*, праведзенага ў 2014 годзе ў 30 краінах свету, чытанне не з'яўляецца самым папулярным відам баўлення часу. Больш за астатнія краіны чытаюць у Індыі (10 гадзін 42 хвіліны на тыдзень), потым у Тайландзе (9 гадзін 24 хвіліны), Кітаі (8 гадзін). Наша найбліжэйшая суседка з тых 30 краін, што ўдзельнічалі ў даследаванні, — Расія — займае сёмую пазіцыю (7 гадзін 6 хвілін). Замыкаюць рэйтынг такія высокаразвітыя краіны, як Японія (4 гадзіны 6 хвілін) і Карэя (3 гадзіны 6 хвілін). Ускосна пра змяншэнне папулярнасці чытання ў нашай краіне сведчыць колькасць выдачы кніг і часопісаў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі за апошнія пяць гадоў: у 2015 годзе гэтая лічба была 2545,9 тыс., а ў 2020 — 1642 тыс.

Падобнае становішча тлумачыцца тым, што чытанне прайграе іншым відам адпачынку: тэлебачанню, інтэрнэт-гульням, сацыяльным сеткам і інш. Літаратура ў сучасным свеце апынулася ў новых незвычайных абставінах. Людзі сталага ўзросту прызвычаіліся ставіцца да кнігі як да чагосьці абавязковага і непазбежнага, бо гэта асноўная крыніца інфармацыі (культурнай, прыродазнаўчай, гістарычнай, псіхалагічнай, сацыяльнай), а таксама трыгер эмацыянальных перажыванняў. Пры гэтым чытанне аднолькавага набору абавязковых тэкстаў фарміравала ў цэлых пакаленняў аднолькавы культурны код. У цяперашні ж час назіраецца іншая сітуацыя: літаратура страчвае статус асноўнай крыніцы інфармацыі, саступаючы месца аўдыявізуальным сродкам перадачы ведаў. Гэта вядзе да збяднення эмацыянальнага інтэлекту і запавольвання развіцця разумовых здольнасцей, што адмоўна адбіваецца на сацыяльнай адаптацыі падлеткаў, няўстойлівасці развіцця, фрагментарнасці ведаў. Даследаванне фарміравання і развіцця сацыяльнага інтэлекту беларускіх вучняў IX і XI класаў, праведзенае ў 2020/2021 навучальным годзе, паказала: толькі 48,1 % рэспандэнтаў добра разумее і кіруе сваімі эмоцыямі, а разумее і кіруе эмоцыямі іншых людзей усяго 12,2 % (Жоголь-Лабзеева, И. П. Рекомендации по результатам изучения личностного развития учащихся (2020/2021 учебный год) / И. П. Жоголь-Лабзеева // Веснік адукацыі. — 2021. — № 7. — С. 9—23).

Сёння нельга сцвярджаць, што працэс чытання з'яўляецца самакаштоўным. Толькі асэнсаванае чытанне можа прынесці сапраўдную карысць асобе, бо праз такі від чытання дасягаецца разуменне інфармацыйнага, сэнсавага і ідэйнага бакоў мастацкага твора. Мэта асэнсаванага чытання — максімальна дакладна спасцігнуць каштоўнасна-сэнсавыя аспекты тэксту, г. зн. ажыццявіць яго інтэрпрэтацыю. Рэгулярнае спасціжэнне мастацкіх твораў поўнасцю перабудоўвае работу галаўнога мозгу. Псіхолагі адзначаюць, што глыбокае асэнсаванае чытанне ("*deep reading*") на працягу доўгага часу дазваляе чалавеку канцэнтраваць увагу на праблеме, больш паспяхова засвойваць складаную інфармацыю. Але чытанне пры гэтым павінна быць рэгулярным, адмова ж ад чытання прыводзіць да змарнення гэтых навыкаў (*Henrich, J. (2010). The weirdest people in the world? / J. Henrich, S. Heine, A. Norenzayan // Behavioral and Brain Sciences. 2010. — V.33(2-3). — P. 61—83*).

Праз спасціжэнне сэнсу мастацкага твора ўдасканальваецца маўленне (думка заўсёды абцяжарана словам) і пашыраецца актыўны слоўнікавы запас, што пазітыўна адбіваецца на разумовым развіцці. Вядомы псіха- і нейралінгвіст Таццяна Чарнігаўская сцвярджае, што актыўнасць глыбінных структур шэрага рэчыва павышаюць менавіта кнігі, у працэсе чытання задзейнічана каля 17 зон мозгу.

У 2018 годзе Беларусь упершыню ўзяла ўдзел у міжнародным параўнальным даследаванні якасці адукацыі *PISA*, якое праводзіцца Арганізацыяй эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця. У гэтым даследаванні найважнейшае месца адводзілася вывучэнню чытацкай адукаванасці 15-гадовых падлеткаў. Было выяўлена, што «найбольш высокія вынікі беларускія навучэнцы дэманстравалі ў заданнях, якія прадугледжвалі пошук інфармацыі (справіліся 64,65 %), а найбольшую складанасць у іх выклікалі заданні, якія патрабуюць прымянення навыкаў ацэнкі і асэнсавання тэкстаў (справіліся 53,04 %). Да ліку цяжкіх для беларускіх навучэнцаў (справіліся менш за палову тых, каго тэставалі) адносяцца заданні, скіраваныя на вымярэнне кагнітыўных уменняў інтэграваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю (разуменне сэнсу), а таксама навыкаў крытычнай ацэнкі і аналітычнага асэнсавання тэкстаў» (Позняк, А. В. *PISA*-2018 в Республике Беларусь. Читательская грамотность / А. В. Позняк ; под науч. ред. Г. С. Ковалевой. — Минск : Медисонт, 2021. — 68 с.).

Так, чытанне сёння — найважнейшы сродак адпаведнасці жорсткім патрабаванням часу. Пры гэтым хуткасць і ўзровень асэнсавання прачытанага неабходна ўвесь час павышаць. Асабліва гэта важна ў падлеткавым і юнацкім узросце, калі назапашваецца база для далейшага прафесійнага і сацыяльнага развіцця. У структуры чытання падлеткаў павінны быць і «сур'ёзная» літаратура, якая фарміруе прымальную мадэль паводзін чалавека, сістэму маральна-этычных каштоўнасцей, і паэтычныя творы, якія развіваюць эмацыянальную сферу асобы, і высокамастацкая «літаратура для адпачынку», якая фарміруе стыль баўлення часу, дае магчымасць працуючы адпачываць.

Працэс асэнсавання твораў мастацкай літаратуры дапамагае набываць і метапрадметныя навыкі. Вучні авалодваюць уменнямі арыентавацца ў кнізе, абагульняць, вылучаць галоўнае і другаснае. Чытанне ў дыялогавым рэжыме сам-насам з'яўляецца своеасаблівай формай самапазнання паўнавартаснай асобы.

Чытацкая мода фарміруецца грамадствам, але і грамадства змяняецца пад пісьменніцкім ціскам, бо захоўваецца высокі аўтарытэт працы пісьменніка.

Яшчэ адным важным выклікам айчыннаму соцыуму з'яўляецца заахвочванне чытача беларускамоўнай літаратуры, каб захаваць носьбітаў мовы тытульнай нацыі краіны. Чытанне пэўных мастацкіх тэкстаў заўсёды было найгалоўнейшым фактарам фарміравання тыпу асобы. Так, цяжка сабе ўявіць сярэднявечнага еўрапейца, на свядомасць якога не паўплывала Біблія. У пазнейшыя часы, калі рэзка ўзрасла роля нацыянальных дзяржаў, пачалі фарміравацца нацыянальныя эліты пад уплывам класічных узораў нацыянальнай літаратуры. Адной з найважнейшых прыкмет дзяржавы і яе нацыі з'яўляюцца родная мова і літаратура. Узровень іх развіцця ў сваю чаргу вызначае ўзровень духоўнага і культурнага развіцця нацыі. Немагчыма ўявіць рускага, які не ведае твораў Пушкіна, паляк не існуе без Міцкевіча, украінец — без Шаўчэнкі. Класіка захоўвае свой статус, бо далучае чытача да жыццёвых універсалій, якія не толькі былі актуальнымі падчас напісання, але ўяўляюцца значнымі ў будучым, фарміруе адметныя для пэўнай нацыянальнасці светапоглядныя ўстаноўкі і выконвае ролю таго ланцуга, які звязвае мінулае, сучаснае і будучыню. Адмаўленне ад вывучэння класічнай літаратуры — шлях вельмі небяспечны, бо размываецца ідэнтычнасць, губляюцца арыенціры і ідэалы. Ні ў якім разе гэты тэзіс не адмаўляе неабходнасці засваення сучаснай літаратуры, асабліва калі яна матывуе на спасціжэнне новага, на развіццё і станаўленне асобы.

Для таго, каб прывучыць дзяцей любіць кнігі, бацькам і настаўнікам трэба зрабіць некалькі важных крокаў.

Па-першае, прыклад дарослых ніхто не адмяняў. Даследаванне *PISA* паказала, што наяўнасць *хатняй бібліятэкі* (з мастацкімі і навукова-папулярнымі выданнямі) павышае паказчыкі беларускіх вучняў па матэматычнай, прыродазнаўчай і чытацкай адукаванасці на 30 і больш балаў (Титовец, Т. Е. *PISA*-2018 в Республике Беларусь. Общая характеристика исследования. Социокультурный контекст / Т. Е. Титовец, М. Б. Горбунова, О. В. Бурак; под науч. ред. Г. С. Ковалевой. — Минск : Медисонт, 2021. — 111 с.).

Эфектыўнай з'яўляецца стратэгія *сумеснага чытання* кнігі дарослым і падлеткам. Гэта дае магчымасць своечасова высветліць незразумелыя словы ці абставіны, якія апісваюцца, а таксама скіраваць увагу на важныя сэнсаўтваральныя элементы тэксту.

Можна паспрабаваць *выразнае чытанне ўголас*. Пачынаць павінен дарослы, тым самым ён адчыняе дзверы для дзіцяці ў свет мастацкага твора. Інтанацыя — праява багацця вуснага маўлення, здольная нават самы сумны тэкст зрабіць яркім і эмацыянальным. Сумесная дзейнасць, звязаная з выразным чытаннем, дапамагае развіваць маўленне, спасцігаць ідэйны змест, а таксама разумець сутнасць знакаў прыпынку.

Гісторыя знаёмства з той або іншай кнігай ад бацькоў ці настаўнікаў часам можа стаць добрым матыватарам для таго, каб прачытаць гэтую кнігу.

Па-другое, важна адшукаць кнігу, якая б была цікавай для дзіцяці. У кожнага чалавека ёсць індывідуальныя захапленні, у адпаведнасці з імі можна знайсці твор сучаснай літаратуры.

Па-трэцяе, добрую справу ў далучэнні да чытання можа зрабіць рэклама (кароткі пераказ да самага напружанага моманту), самастойнае стварэнне буктрэйлера або прагляд ужо гатовых, прагляд уступнага роліка (яркім узорам з'яўляецца ролік, да якога можна перайсці па *QR*-кодзе, змешчаным у кнізе Кацярыны Хадасевіч-Лісавой «Ключ ад Вялікай Каштоўнасці»).

Па-чацвёртае, неабходна прызнаць, што сучасны вучань па-іншаму ставіцца да літаратуры. Сёння мастацкі твор ужо не сакралізуецца, таму «ўваходжанне» ў мастацкі свет і яго ўспрыманне адбываюцца інакш. Настаўнік павінен улічваць гэтыя абставіны пры падрыхтоўцы да ўрокаў літаратуры. Неабходна падтрымліваць розныя практыкі чытання для развіцця і замацавання чытацкіх інтарэсаў. Напрыклад, урок па вывучэнні класічных твораў павінен арганізоўвацца з улікам сучасных абставін: творчасць пісьменніка варта разглядаць праз кантэкст надзённых праблем і гістарычнай рухомасці мастацкага твора (Макарэвіч, А. М. Беларуская дзіцячая літаратура ў тэрмінах і паняццях: дапаможнік / А. М. Макарэвіч, В.І. Караткевіч; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча. — Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2014. — 140 с.). І тут можа дапамагчы сувязь вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» з сумежнымі дысцыплінамі — «Беларуская мова», «Гісторыя Беларусі», «Сусветная гісторыя», «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» і інш., а таксама сумежнымі навуковымі галінамі — псіхалогіяй, сацыялогіяй, філасофіяй, тэатразнаўствам і інш.

Такім чынам, адраджэнне і развіццё масавага чытання, стварэнне моды на такое баўленне часу, на наш погляд, з'яўляецца адной з прыярытэтных задач беларускага грамадства. Гэта не толькі павінна павысіць паспяховасць нашых дзяцей у будучым, але і даць магчымасць захаваць і развіваць традыцыйныя духоўныя каштоўнасці: мову і культуру беларускага народа. Без выканання гэтай умовы цяжка ўявіць будучыню.

Па адрасе невядомай сядзібы

Веру Данілаўну Міцкевіч усе, хто цікавіцца гісторыяй беларускай літаратуры, добра ведаюць як дасведчанага коласазнаўца. Унучка народнага песняра Беларусі, яна шмат зрабіла для ўшанавання памяці стваральніка «Новай зямлі», «На ростанях» і іншых неўміручых твораў. Вера Міцкевіч таксама з'яўляецца аўтарам многіх адметных артыкулаў пра атачэнне Якуба Коласа, мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю класіка беларускай літаратуры.

Можа быць, якраз па гэтай прычыне і неспадзяванай падалася яе кніга «Сядзіба Качэрычы: шляхамі Ланеўскіх-Ваўкоў, фон Гераў і іх нашчадкаў», якая пабачыла свет на дзвюх мовах — беларускай і рускай. Сядзіба Качэрычы Бабруйскага павета Мінскай губерні (цяпер — на тэрыторыі сучаснага горада Кіраўска Магілёўскай вобласці) звязана з дваранскімі родамі Ланеўскіх-Воўкаў і фон Гераў — продкамі літаратараў, сярод якіх была вядомая расійская пісьменніца-гумарыстка Надзея Тэфі. Заўважым, што назву Кіраўск напрыканцы 1934 года атрымалі хутары каля вёскі Старцы і сяло Качэрычы. На пачатку 1935 года быў утвораны Кіраўскі раён.

Інфармацыя пра гаспадароў маёнтка Качэрычы адсутнічае нават у такім грунтоўным выданні, як энцыклапедычны шматтомнік «Гарады і вёскі Беларусі». Хаця старадаўні парк на тэрыторыі колішняга маёнтка часткова захаваўся. Цяпер тут працуе санаторый імя К. П. Арлоўскага, ураджэнца гэтых мясцін, Героя Савецкага Саюза і Героя Сацыялістычнай Працы, чалавека ў Беларусі і ў Савецкім Саюзе добра вядомага. Санаторый пасля рэканструкцыі 2011 года мае новы выгляд і сучасную лячэбную базу. І вось што піша на першых старонках кнігі Вера Міцкевіч: «Кіраўнік санаторыя, выдатны арганізатар сваёй справы Вольга Усеваладаўна Гаршкова расказвала мне, што акрамя прозвішча апошняга гаспадара былога маёнтка Качэрычы — фон Гоер, — пра гэтыя мясціны невядома, а хацелася б ведаць болей і стварыць невялікі экскурс для тых, хто тут адпачывае. Шчыра кажучы, добразычлівыя адносіны ўсяго персаналу санаторыя, прафесійнае выкананне абавязкаў, зацікаўленасць, а таксама захаванасць і таямнічасць велічнага парку падштурхнулі мяне адгукнуцца і распачаць пошукі».

Аўтар кнігі прасачыла радаводную лінію Ланеўскіх-Ваўкоў. Сярод іх — вельмі цікавыя асобы. У тым ліку — і Даніэль, які атрымаў у спадчыну маёнтак Нястанавічы Мазырскага павета, меў у пажыццёвым валоданні маёнтак Некрашы Мазырскага павета, служыў у войску літоўскім, быў дэпутатам Галоўнага трыбунала ВКЛ (1702), паслом ад навагарудскага ваяводства да караля Станіслава Ляшчынскага і караля шведскага Карла XII, падчас Паўночнай вайны шматразова абіраўся на пасады паслоў, суддзяў у Мазырскім павеце. Таксама Мікалай, палкоўнік, шамбялян. Валодаў маёнткам Косічы Быхаўскага павета, рагачоўскі павятовы маршалак (1797—1799). Ды і іншыя, не меней цікавыя асобы. Што да фон Гераў, то даследчыцы асобныя факты іх жыцця на беларускіх землях удалося адкрыць дзякуючы ўнучцы Аляксандра і Надзеі фон Гераў — Надзеі Лахвіцкай (дачка Варвары), якая стала пісьменніцай — «...непараўнальнай Тэфі». Выходзіць, што Надзея Тэфі (Надзея Аляксандраўна Бучынская. Дзявочае прозвішча Лохвіцкая, 1872, Санкт-Пецярбург — 1952, Парыж), як і яе сёстры, па лініі маці паходзіць не толькі з нямецкага роду фон Гоер, але і з беларускага шляхетнага роду Ланеўскіх-Ваўкоў. З Качэрычаў родам іх бабуля Надзея Феліцыянаўна. Дарэчы, вядома, што пасля нараджэння першай дачкі Тэфі разам са сваім першым мужам Уладзіславам Бучынскім пасялілася ў яго маёнтку пад Магілёвам. У 1910 годзе ў выдавецтве «Шиповник» выйшла першая кніга вершаў Тэфі — «Семь огней». Пісьменніца ўваходзіла ў штат пастаянных супрацоўнікаў славутага часопіса «Сатирикон». Прыхільнікам Тэфі быў імператар Мікалай II. Імя пісьменніцы было выяўлена на цукерках. Надзею Тэфі называлі першай рускай гумарысткай пачатку XX стагоддзя. Сястра Тэфі — паэтэса Марыя Лахвіцкая (1869—1905), заснавальніца рускай «жаночай паэзіі», якая адкрыла шлях да чытача Ганне Ахматавай і Марыне Цвятаевай. У 1897 і 1905 гадах — двойчы! — атрымала Пушкінскую прэмію. Крытыкі пісалі пра Лахвіцкую: «…Яна была адна з першых жанчын, якая так адкрыта гаварыла пра каханне з жаночага пункту гледжання, як раней гаварылі пра яго, са свайго боку, толькі паэты…» Так, паэтэса парушыла межы паэзіі, дазволіла сабе тое, што было адно толькі пад уладай пісьменнікаў-мужчын…

Са славутага роду фон Гераў, і пра гэта піша Вера Міцкевіч, — Соф'я Аляксандраўна Давыдава (1842—1915). Яна з'яўляецца аўтарам многіх прац, прысвечаных рускаму карункаваму мастацтву. У тым ліку і даследаванні «Рускія карункі і рускія каруначніцы» (1892 год).

Шукаючы розныя архіўныя, крыніцазнаўчыя матэрыялы, Вера Міцкевіч высветліла, што ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі знаходзіцца рарытэтны экзэмпляр зборніка Тэфі «Книга Июнь» (1931 года выдання) з аўтографам пісьменніцы, адрасаваным Міхаілу Асаргіну (1878—1942), расійскаму пісьменніку, масону.

Брат пісьменніцы — Мікалай Аляксандравіч Лохвіцкі (1867—1933), рускі генерал, георгіеўскі кавалер, падчас Першай сусветнай вайны камандаваў Рускім экспедыцыйным корпусам у Францыі і быў узнагароджаны крыжам Ганаровага легіёна. Адзін з апошніх уладальнікаў Качэрычаў — Леў Віктаравіч фон Гоер (1875, Мінск — 1939, Парыж). Юрыст, фінансіст, сапраўдны стацкі саветнік, пісьменнік, масон, банкір, ранцье. Быў членам Праўлення Руска-Кітайскага банка, працаваў фінансавым агентам Міністэрства фінансаў Расійскай імперыі ў Кітаі і Японіі. З 1920 года — у эміграцыі ў Кітаі. Займаў пасаду дырэктара Руска-Азіяцкага банка ў Манчжурыі і Шанхаі. Аўтар работ, прысвечаных Далёкаму Усходу. У Парыжы выйшаў шэраг кніг Льва фон Гоера масонскай тэматыкі. Адно з выданняў з аўтографам пісьменніка знаходзіцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Не чужым для мастацкага слова быў і апошні гаспадар Качэрычаў — Уладзімір Віктаравіч фон Гоер (1874—?). У 1909 годзе ў Бабруйскай друкарні выйшла яго п'еса «Акультысты» ў чатырох дзеях на 189 старонках.

Выдатна, што кніга В. Міцкевіч дапоўнена перакладам на рускую мову. Тэму Качэрычаў і іх гаспадароў даследуюць у розных краінах свету. Магчыма, і ў працы Веры Данілаўны будзе болей шырокі працяг. Кніга пра сядзібу на тэрыторыі сучаснага райцэнтра Кіраўск нагадвае, што па-за ўвагай мясцовых краязнаўцаў знаходзяцца многія і многія тэмы, як патрэбны асобныя выданні пра многія старадаўнія сядзібы. Будзем спадзявацца на руплівасць аўтараў, даследчыкаў гісторыі роднага краю, якія працуюць у рэгіёнах. Тым больш што многія адрасы, у прыватнасці, на Гродзеншчыне, Берасцейшчыне, Міншчыне, ім падкажуць грунтоўныя кнігі доктара біялагічных навук Анатоля Тарасавіча Федарука, прысвечаныя старадаўнім сядзібам.

Кнігу «Сядзіба Качэрыцы…» можна набыць у Мінску па адрасе: праспект Незалежнасці, 72, кнігарня «Акадэмкніга».

Раман СЭРВАЧ

Як пазбавіцца «лунных лап»?

Нататка першая паводле часопіса «Узвышша»

Сярэдзіна і другая палова 1920-х гадоў характарызаваліся актыўным запаўненнем наяўных у беларускай мове лакун. Былі выдадзены перакладныя слоўнікі і тэрміналагічныя зборнікі, ішла дыскусія наконт ужывання асобных слоў і выразаў, граматычных формаў, абмяркоўвалася графічная сістэма. Не засталося ў баку ад моўных пытанняў і літаратурна-мастацкае згуртаванне «Узвышша», а аднайменны часопіс увёў рубрыку «Культура мовы». Спынімся на некаторых пытаннях, закранутых у часопісе і карысных для сучасных рэдактараў.

У артыкуле «Пра нашу літаратурную мову» (1927, № 2) У. Дубоўка, адзначыўшы, што «наша лексікалогія знаходзіцца ў першабытным стане», засяроджваецца на дакладнасці, дарэчнасці і правільнасці словаўжывання. Перадусім адзін з заснавальнікаў згуртавання закранае нятворчае калькаванне з рускай мовы ў раздзеле «Лунныя лапы», дзе прыводзяцца наступныя прыклады з верша Анатоля Вольнага: *І такія смяшныя сляды // **Лунных** лап па **уцёсах** ляглі*; *Фасфарыстыя **ўхмылкі луны*** і інш. Аўтар артыкула адзначае: «Я не праціўнік, а прыхільнік запазычанняў з суседніх моваў, але толькі ў тым выпадку, калі гэта вымагаецца неабходнасцю». Менавіта яна павінна быць матывавальнай падставай для пісьменнікаў і журналістаў, каб выкарыстаць пазычанае слова замест свайго, якое фіксуецца слоўнікамі. Да прыкладу, дапускаецца выкарыстоўваць пазычанні ў якасці характаралагічнага сродку, як гэта зрабіў Іван Мележ у дачыненні да Дубадзела: «Граждане, а таксама грамадзянкі сяла Глінішча! І особенно — калхознікі, якія ўчора разабралі сваю маёмасць і тым самым выйшлі з калхоза "Рассвет"».

У. Дубоўка абураецца тым, што названы верш, апублікаваны спачатку ў газеце «Савецкая Беларусь», быў без змен уключаны ў зборнік «Чарнакудрая радасць», і такім чынам акцэнтуе ўвагу на працы рэдактараў. Менавіта іх дасведчанасць, моўная абазнанасць павінны стаяць на абароне тэксту ад «лунных лап».

Выраз «лунныя лапы» падхоплівае Кузьма Чорны ў артыкуле «Небеларуская мова ў беларускай літаратуры» (1928, № 5). Як супрацоўнік рэдакцыі газеты «Беларуская вёска», пісьменнік чытаў «вельмі шмат допісаў з вёскі і літаратурных твораў маладых вясковых аўтараў», быў знаёмы з публікацыямі ў літаратурных часопісах, наведваў беларускія тэатры. Свае ўражанні аўтар артыкула выказвае наступным чынам: «траха не ўсе нашы часопісы і газеты, а таксама творы некаторых пісьменнікаў выходзяць у свет у гэтакай мове, якую можна назваць сапраўды толькі "наречием". Фразеалогія гэтае мовы зусім не беларуская». Пад «фразеалогіяй» К. Чорны разумее структуру фразы, пабудову выказвання ў адпаведнасці з народнымі традыцыямі, бо ў адваротным выпадку «ў быце беларускае вёскі, напрыклад, мова будзе адна, з усім яе хараством і багаццем арыгінальных формаў, а ў кнігах для гэтых жа самых людзей мова будзе іншая». Пісьменнік імкнецца давесці, што літаратару трэба вучыцца ў народа, а не ствараць нейкую штучную канцылярскую мову, у якой і заваду няма беларускага светапогляду, а толькі канцыляршчына і штучнасць. Прыводзячы прыклад з убачанага і пачутага ў спекталі БДТ-2 («Бяжыць сялянка і крычыць: "У чым справа, у чым справа?"»), К. Чорны канстатуе: «Няўжо гэта крычыць сялянка? Не, гэта крычыць сам аўтар п'есы».

Шмат якія назіранні знакамітых творцаў, іх прапановы, выказаныя ва «Узвышшы» ў другой палове 1920-х гг., не страцілі актуальнасці і сёння. «Лунныя лапы» не зніклі з публікацый, што пацвярджаюць сказы з маёй картатэкі, бо ніякай «неабходнасці» ўжывання папраўленых лексем не назіраецца: *курс на ~~цыфравізацыю~~* [*лічбавізацыю*]; *з ~~парубанымі~~* [*пасечанымі*] *нядаўна дровамі*; *сезонных модных ~~нарадаў~~* [*убораў*, *строяў*]; *райскі куток ~~са скамейкамі~~* [*з лаўкамі*]; *ужываю ~~лук~~* [*цыбулю*] *і часнок*; *справа аб разглядзе ~~пастанаўлення~~* [*пастановы*] і да т. п. Паводле падлікаў, сярод лексічных недахопаў у сучасных беларускіх тэкстах да 50 адсоткаў складаюць памылкі — «лунныя лапы».

У. Дубоўка адзначае: «Агульнавядомае правіла кажа, што мова мастацкіх твораў павінна быць *узорнай*. А якой узорнай можа быць мова таго пісьменніка, які не сочыць за развіццём мовы, што і выклікае "лунныя лапы". Дзіўным здаецца, наколькі мы мала знаёмы з дасягненнямі нашае сучаснае мовы». *Ergo*, ведаць мову прафесійна — грунтоўны падмурак напісання якаснага твора і яго рэдагавання перад абнародаваннем.

Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ

Ігар ПРАКАПОВІЧ

* * *

Заснула вёска… Цішыня
Наўсцяж лягла.
Пасля турбот зямнога дня
Зноў ноч прыйшла.

Блакітна-чорны небасхіл
Зямлю накрыў.
Асеў на выган дзённы пыл,
Туман паплыў.

Ляціць планета-карабель
У змрок начны.
І праз фіранку дзікі хмель
Салодзіць сны.

І хай бы так было заўжды
У днях жыцця:
Няма вайны, няма бяды.
І ёсць працяг…

* * *

Люблю, калі раніцай
сонца павольна ўстае,
І цёплыя промні
па роснай бягуць сенажаці.
Так добра прачнуцца
ў вёсцы ў дзедавай хаце
І слухаць, як дзесьці
ля возера
райская птушка пяе.

…А сонца заход не люблю…

* * *

І быццам ёсць сябры,
І быццам ёсць жанчыны,
Ды ўсё адно — адзін
на ўвесь бялюткі свет.
Так высака ў гары
Чародак жураўліны,
Ды і сініц калі
ці налавіў паэт?

Імгліцца далячынь,
Туманіцца прастора.
Як у бяздонны вір
ляціць у прорву час.
Паўзе праз горад стынь,
І цёплае ўчора
Не вернецца, бо ўсё
бывае толькі раз.

Хай не злуюць сябры,
Не крыўдзяцца жанчыны,
Што я чарговы раз
з мабільнай хвалі знік.
То проста: у гары
Чародак жураўліны
Па скрыпачцы нябёс
самотны цягне смык.

* * *

Калі і ты ўжо будзеш не са мной,
Пакіну горад і паеду ў вёску,
Дзе каля возера ёсць хата над вадой,
Дзе цішыня і хваляў лёгкіх плёскат.

Там разам з сонцам буду я ўставаць,
І ў ложак класціся таксама буду з сонцам,
І кожны дзень як вечнасць адчуваць,
І ўспрымаць ваколле як бясконцасць…

* * *

Калі-небудзь цябе я ўсё ж забяру
У той край, дзе схіляецца бэз над вадою,
Дзе азёрныя хвалі цалуюць зару,
І дзе будзем адны мы з табою.

Там ніхто не парушыць цнатлівы спакой,
Хіба музыка ціхая ветрам пральецца,
І руцэ будзе добра ў абдымках з рукой,
І святлом будзе поўніцца сэрца.

На пяшчоту пяшчотай адкажа душа
І гарачыя сэрцы насустрач памкнуцца —
Прападзе і растворыцца ростані ржа,
Вусны шчасця да болю нап'юцца.

…Зноў азёрныя хвалі цалуюць зару,
І яна расставацца не хоча з вадою…
Калі-небудзь цябе я ўсё ж забяру
У той край, дзе адны мы з табою…

Сэрца б'ецца

Без тваіх вачэй сумую,
Без пяшчоты рук хварэю.
Нібы ў Арктыцы зімую,
Ад марозаў ледзянею.

І прастор вакол бязмежны,
І нябёсаў край бясконцы.
А чаму на сэрцы снежна?
І чаму так мала сонца?

Чую ветру спеў самотны,
Бачу хмар палёт свінцовы.
Свет вакол такі халодны,
Непрытульны і суровы.

Змрочна стынь стаіць
сцяною,
І нідзе няма сагрэцца.
…Цела ходзіць па пакоі.
…Сэрца б'ецца, б'ецца, б'ецца…

* * *

Пунсовае сонца гуляе
У сцішаным садзе зімовым,
У белых снягах прымярае
Пашытыя веяй абновы.

Яе залатое праменне
На дрэвах святочна іскрыцца.
І сціплае, быццам, адзенне,
А як жа яно зіхаціцца!

За садам —
бясконцасць прасторы,
Што свежаю вабіць лыжнёю
У край цішыні
і пакоры,
Дзе людзі святлеюць душою.

Жыццё запаволіць зямное
У садзе, дзе сонца гуляе,
Праменне каб ліць залатое
Для тых, хто жыве і кахае…

Галіна ЗЫРАНАВА

* * *

Не твая. Не свая. Не чужая.
Замест сонца ў вадзе — багна жалю.
Замест птушкі ў руках толькі пёрка,
І на вуснах душы горка-горка.
Нібы ўсе арабіны планеты
Засланілі сабой тое лета,
Дзе надзеям духмяна ад збожжа,
Дзе лунае жыццё пераможна,
Дзе маўчанне, спавітае песняй,
Дзе магчыма бязмежнасць акрэсліць,
Дзе сланечнікам высіцца праўда,
Дзе ад шчырасці плодзіцца радасць,
Там, дзе гімнам прачулыя словы,
Што руйнуюць зымшэлыя сховы,
Пад якімі струменяць крыніцы...
Не змаглі. Не схацелі спыніцца
Да таго, як струхлелае смецце
Па дарогах раскідае вецер,
А на чыстых квяцістых прасторах
Закалышацца сіняя мора,
Затуляючы сонца, аблокі
І мяне ад нясцерпнае спёкі,
Што і ўвосень бывае пральецца
Тваім імем у самае сэрца.
Не, не бойся. Твайго павяртання
Не прашу. Не хачу. Маё ранне
Раздарыла ўжо ўсім, да гадзіны.
Так, не бойся. Ты больш не адзіны.
Не абражу цябе ні цяплом ані ўсмешкай.
Хіба толькі прасоленым вершам...
Ды за мной тут якая правіна?
Гэта восень твая. І твае арабіны.

* * *

Ведаеш, гэта такое дзіва —
Шчасця не мець, а быць шчаслівай...
Ні азоў рэўнасці, ні тэорый пакут,
Проста акрыленасць —
ты ёсць, ты тут.
Ведаеш, гэта такое шчасце —
Даваць перш, чым браць,
беручы не красці,
Калі ні рухаў, ні слоў не трэба,
Бо ўсё, што пад нагамі і над галавою, —
Неба.
Ведаеш, гэта такая радасць —
Розуму не траціць, не смакаваць здрады,
Не спыняць дождж, што ліецца,
Пакідаць зямлі памяць, аблокам —
сэрца.

Пэўна, гэта вар'яцтва такое —
Усё нішто, апроч роўнасці і спакою,
Калі можна ў рыззі і напаўгалодным
Вольна чуць сябе і па-княску годна...
Пэўна, гэта пракляцце веку —
Дыхаць напоўніцу, быць чалавекам,
Лічыць моманты, а не гадзіны,
Усведамляць, што Ты на свеце адзіны....
Пэўна, гэта ўсё злыя чары —
Прага знішчаць страх,
нараджаць мары,
Быць часткаю міжмоўнае ідыёмы,
Любіць таго, з кім яшчэ не знаёмы...

Можа і праўда гэта вар'яцтва і чары —
Бачыць вясёлку ў саване хмараў,
Вясну гукаць пасярод ночы ў лютым,
Хадзіць па ільдзінах сляпым і разутым?
Ці ж не вар'яцтва? Не чары?

Толькі ведаеш...
Гэта такое дзіва —
Расці штодня,
хай бязгучна і крыва,
І рымскаю быць
між арабскіх адзінак,
Цягнуцца да сонца
крыламі галінак —
Шчасце
Неверагоднае
Шчасце
І радасць
І дзіва.

* * *

Я буду травой шчыраваць на бяствара-
разлеглай раўніне,
У моры пяску, між парэпаных
спінаў рудых
камянёў.
Я буду травой — дзень пры дні
адміраць, каб
жывы не загінуў,
Зялёнаю зоркай знікаць уначы,
каб нараніцу
зноў
Танюткія парасткі выпусціць
птушкамі з клетак
карэння
Насустрач вятрам, прамяням, да
чыіхсьці
знясіленых ног.

Фота Каспуся Дробава.

Я буду травой, што не ведае стомы,
знямогі,
старэння,
Зялёнай надзеяю на скрыжаванні
здзічэлых
дарог.

Я буду травой, што жыццё зберагае пад
тоўшчаю снегу,
Каб спёцы аддаць апасля разам
з фарбай лісцін,
Я буду травой, што сілкуецца
сокам падземнага
бегу,
Нязломнай травою,
што ўмее нябачна расці і
цвісці.
Я буду травою, хоць мне не стае
яшчэ сілы і
веры.
Бо ходзікаў стрэлкі па коле Любові
ад веку
ідуць.
Я стану травою, каб сталі
травянымі Чорныя
Дзверы.
Ты толькі жыві, Маё Сонца,
гары і заўжды
дзесьці будзь...

* * *

Баваўняныя сны мае...
У іх сонца жыве над возерам
І, як толькі з пярыны ўстае,
У ваду — плюх!
Касматае, босае.
Разбіваючы люстра зямлі
На расінкі, крышталікі інею,
З-пад якіх на далонь матылі
Высыпаюць валошкамі сінімі
І трапечуцца крыламі слоў,
Баваўняна-падатлівай песняю
Пра жыццё,
што не клеіцца зноў
Ці па швах разыходзіцца месцамі,
Пра вайну з ветракамі ў стынь,
Пра надзеі і здрады з адпомстамі,
Пра струхлелы
ад звычкі кастыль
І пра ўсё геніяльнае-простае.
Сонца ведае справу сваю:
Дзень пры дні на зямлю
з неба коціцца.
Я ж вярбою ў люстэрку стаю,
Матылі на галінкі ўсё мосцяцца…

Знічкі вечнасці

Лірычныя мініяцюры



Уладзімір МАЗГО

Калыска долі

Пасля службы ў войску мяне другі раз у маім жыцці запрасілі на Рэспубліканскі семінар маладых пісьменнікаў у Каралішчавічах. Я, зразумела, з радасцю пагадзіўся, бо за гэты час выпаў з літаратурнай абоймы, знаходзячыся далёка ад радзімы. Трэба было навёрстваць упушчанае. Да таго ж у мяне быў падрыхтаваны рукапіс першай кнігі паэзіі «Пад спеў крыніц», запланаванай да выхаду на наступны год у выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Тут, пад шатамі вечназялёных сосен, маладыя семінарысты марылі ўзысці на свой літаратурны Парнас. А людзі сабраліся даволі вядомыя ў літаратурных колах: Анатоль Сыс, Віктар Шніп, Алесь Жыгуноў, Ала Канапелька, Васіль Сахарчук…

Паэтычны семінар у нас вёў знакаміты паэт Пятрусь Макаль. Пётр Міхайлавіч рупліва вучыў пачаткоўцаў адрозніваць сапраўдную паэзію ад пустазелля. Але, як ён прызнаўся пазней, вучыўся ў маладых таксама. У яго кнізе «Калыска долі» я сустрэў такія радкі:

У быстрыні крутой —
І зор, і дум калыска.
Жаданы бераг той
Здаецца гэтак блізка

— Яшчэ, яшчэ, яшчэ!
Ці ж не занадта многа?
Ах, як рака цячэ —
Бясконцая дарога.

З разбегу, сцяўшы дых,
І я з вадой лучуся…
Вучу я маладых —
У маладых вучуся.

Шчыра і пераканаўча. Ці не праўда?..

Дарэчы, гэтую кнігу я атрымаў ад пісьменніка праз некалькі гадоў пасля нашага семінара з наступным аўтографам: «Ул. Мазго, цудоўнаму чалавеку, таленавітаму паэту, — з пажаданнем вялікага шчасця. П. Макаль. 6.12.85».

Танцпляцоўка

Калісьці тут, у гарадскім парку, насупраць цяперашняй гімназіі № 1, знаходзілася танцпляцоўка. І мы, старшакласнікі мясцовай школы, звычайна спяшалі сюды не толькі патанчыць, але і паслухаць тагачасныя шлягеры.

Моладзь збіралася тут з Зэльвы і яе ваколіц: Бародзічаў, Бярэжак, Горны…

Мы бегалі на танцы,
Малыя падшыванцы,
І танчылі так лоўка —
Вірыла танцпляцоўка,
Што адкрывала дзіва,
Наш легендарны віа.

А запальваў нашы сэрцы вакальна-інструментальны ансамбль «Русічы» раённага Дома культуры пад кіраўніцтвам Станіслава Казакевіча. Гучалі «гарачыя» шлягеры беларускіх, расійскіх, замежных кампазітараў, а таксама тутэйшых аўтараў.

— Добры вечар, дзяўчыначка, куды йдзеш?

Скажы ты мне праўдачку, дзе жывеш?

— Я жыву ля рэчанькі, ля вады,

Збудаваўшы хатачку з лебяды.

Вечаровыя мелодыі, здавалася, разгойдвалі навакольныя прасторы. Мы танцавалі і спявалі. Мы з песнямі сталелі.

Паміж наведвальнікаў танцпляцоўкі можна было нават сустрэць будучых айчынных зорак: чэмпіёна свету па гандболе сярод юніёраў Уладзіміра Міхуту, лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі Уладзіміра Ягоўдзіка і інш. Усіх іх, як магнітам, сваімі чароўнымі мелодыямі прыцягвала танцпляцоўка.

Помніцца, наш клас збіраўся ехаць на экскурсію ў Брэст. А ў гэты час па Беларускім тэлебачанні ішла трансляцыя рэспубліканскага тэлевізійнага конкурсу «І майстэрства, і натхненне», у якім удзельнічалі нашы «Русічы». Я паглядзеў на адным дыханні паспяховае выступленне землякоў, прабег тры кіламетры ад Бярэжак да сваёй школы і паспеў ускочыць у апошні момант у экскурсійны аўтобус.

Сягоння, калі я прыязджаю на радзіму і праходжу міма таго знакавага месца, дзе калісьці віравала танцпляцоўка, адчуваю, што мне нечага тут вельмі не хапае. Магчыма, менавіта той звонкагалосай танцпляцоўкі, як часцінкі нашага далёкага шчаслівага юнацтва.

Навагодняя варта

Снежнай зімою 1980—1981 гадоў наша рота вельмі часта заступала ў каравулы. Мае саслужыўцы нават жартавалі: «праз дзень на рамень».

І трэба ж было надарыцца такому, што менавіта 31 снежня, напярэдадні надыходзячага Новага года, мы ізноў апынуліся ў каравуле.

Але галоўная іронія лёсу для мяне была, як аказалася, не ў гэтым. Я патрапіў у змену, якая заступала на варту ў 23 гадзіны старога года, а змянялася ў гадзіну ночы нова. А гэта значыць, што Новы 1981 год я сустракаў на пасту.

Як толькі развадзяшчы і зменены вартавыя зніклі ў каравульным памяшканні, я прыступіў да сваіх службовых абавязкаў. Аб'ект, што знаходзіўся пад нашай аховай, быў на ўскраіне прыбалтыйскага Калінінграда. І нашымі суседзямі з'яўляліся старыя даваенныя фарты, нібыта замаскіраваныя белым снегам. А холад — проста жахлівы.

У шапцы-вушанцы, кажуху і валёнках, з аўтаматам Калашнікава на плячы, я ў гэты момант напэўна нагадваў вайсковага Дзеда Мароза. Абышоўшы па перыметры межы свайго паста, паволі ўзняўся па заледзянелых прыступках на вартавую вышку, з якой было бачна ледзь не ўсё наваколле. Гэтаму акурат спрыялі запаленыя на слупах ліхтары.

Стрэлкі гадзінніка няўмольна набліжаліся да 12. Да Новага года заставаліся лічаныя хвіліны. У гэты момант у памяці праплылі прамінулыя навагоднія святы да войска. Яскрава ўявілася, як зараз святкуюць сваякі, сябры, калегі там, дзе нас сягоння няма. І прыйшло разуменне вялікай адказнасці за іх мірнае заўтра.

Калі мы вярнуліся пасля змены ў каравульнае памяшканне, нас там ужо чакаў незвычайны навагодні стол: духмяная гарбата, салодкія цукеркі і пячэнне. У гэты міг яны былі для нас смачныя як ніколі.

Не абышлося ў гэтую ноч, на жаль, без кур'ёзаў. Калі на досвітку мы выйшлі на чарговую змену, то доўга не маглі знайсці аднаго вартавога. І тут мы ўбачылі на снезе ланцужок слядоў, што вёў да прыпаркаваных непадалёк аўтамабіляў.

Як аказалася, каб сагрэцца, наш вартавы залез у кабіну незачыненай машыны і заснуў. І ўсё ж мы вырашылі дараваць яму гэтае непаразуменне ў навагоднюю ноч пры ўмове, што падобнае болей ніколі не паўторыцца.

Землякі

Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі пісьменнік Уладзімір Ягоўдзік нарадзіўся ў вёсцы Кастровічы Слонімскага раёна. Але ён можа з поўным правам лічыць сябе і зэльвенцам таксама.

Чаму? Паспрабую адказаць на гэта пытанне.

Па-першае, у той час, калі Валодзя толькі з'явіўся на свет, Кастровічы ўваходзілі ў склад Зэльвенскага раёна. Па-другое, Ягоўдзік скончыў Зэльвенскую школу-інтэрнат, дзе атрымаў атэстат аб сярэдняй адукацыі. Па-трэцяе, у Зэльве жыла Валодзева цётка, да якой ён часта наведваўся ў госці.

Памятаю, як пасля аднаго яго прыезду з БДУ, дзе ён вучыўся на філфаку, а я яшчэ быў школьнікам, мы прабіраліся разам з ім гародамі напрасткі да ракі Зальвянкі. На беразе Валодзя дастаў з сумкі кнігу Янкі Брыля і доўга з захапленнем чытаў мне лірычныя мініяцюры класіка. У гэты міг ён, мабыць, нават не здагадваўся, што праз тры дзясяткі гадоў народны пісьменнік Беларусі напіша прадмову да двухтомніка яго «Выбранага».

Пяцьдзясят гадоў таму, 1 студзеня 1973 года, мы ўпершыню сустрэліся з цёзкам на літаратурнай старонцы «Зоры над Зальвянкай» у зэльвенскай раённай газеце «Праца». Там быў надрукаваны мой дэбютны верш. А Валодзя выступіў з двума новымі вершамі, якія я магу прачытаць на памяць нават сёння. Простыя, цёплыя і шчырыя, яны лёгка запаміналіся. Ягоўдзік ужо тады быў даволі вядомым паэтам у Зэльве.

У час нашай вучобы ў школе быў адзін настаўнік беларускай мовы і літаратуры — Аляксандр Міхайлавіч Голуб, які заўсёды шчыра падтрымліваў нашы першыя творчыя крокі. А потым быў адмоўны катэгарычны ліст ад рэдактара аддзела паэзіі часопіса «Маладосць» Міколы Аўрамчыка на прапанаваныя да друку вершы нашага земляка, чытаючы які, мы адчувалі сапраўдны шок.

Хто ведае, а можа Валодзя ўсё ж павінен быць удзячны Міколу Якаўлевічу за тое, што не стаў паэтам. Бо ён стаў цудоўным празаікам, драматургам, публіцыстам…

Вялікім попытам у жыхароў студэнцкага інтэрната на Паркавай карыстаўся нумар «ЛіМа» з дэбютным апавяданнем Уладзіміра Ягоўдзіка «Стрэл дуплетам» і прадмовай Яўгена Лецкі. Мы перадавалі яго з рук у рукі, а потым горача абмяркоўвалі.

Нядаўна, перачытваючы кнігі свайго земляка, я звярнуў увагу на два аўтографы.

На кнізе «Стронга»: «Дарагому Валодзю Мазго — земляку, паэту з пажаданнем новых добрых вершаў і на доўгае сяброўства між намі. 21.06.84 г. Ул. Ягоўдзік».

У двухтомніку «Выбранае»: «Валодзю Мазго на ўспамін пра далёкія воблакі нашага зэльвенскага юнацтва! 26.10.2005 г. У. Я.».

Я і цяпер, здаецца, бачу тыя белапенныя воблакі, што няспынна гайдаліся на хвалях нашай хуткаплыннай Зальвянкі.

Адвечная песня

Ездзілі з Алесем Карлюкевічам у Мар'іну Горку на дзевяностагадовы юбілей паэта Генадзя Кляўко. Амаль усю дарогу Алесь Мікалаевіч, слынны краязнаўца і нястомны літаратуразнаўца, з глыбокім досведам распавядаў пра сваю малую радзіму і славутых землякоў.

А іх тут нарадзілася нямала. Гэта — і пісьменнікі, і кампазітары, і хлебаробы… Адзін толькі Ігар Лучанок чаго варты. Яго песні спявае ўся Беларусь.

Імпрэза, прысвечаная жыццю і творчасці Генадзя Кляўко, адбывалася ў Пухавіцкім раённым краязнаўчым музеі. Выступілі самыя блізкія пісьменніку людзі: сын, нявестка, унук, а таксама землякі.

Далі слова і гасцям. Мы ў сваю чаргу адзначылі важкі ўнёсак пісьменніка ў скарбонку беларускай літаратуры, падзяліліся незабыўнымі ўспамінамі.

Пасля нашага выступлення Алеся Карлюкевіча абступілі землякі. Творца натхнёна і ўсхвалявана адказваў на разнастайныя пытанні. А твары мар'інагорцаў у гэты міг святліліся сонечнай радасцю.

І я падумаў: як усё ж важна і адказна падарыць людзям радасць сустрэчы з табой і з тваёй творчасцю, калі яны гэтага вельмі чакаюць.

Па дарозе ў Мінск з глыбіняў нашай памяці ўсплывалі незабыўныя мелодыі Ігара Лучанка. Як сказаў бы з гэтай нагоды паэт Генадзь Кляўко:

І вырвецца песня
Сама на разлог,
Якую так доўга
Знайсці ты не мог.

Сто гадоў

Заўсёды з нецярпеннем чакаю чарговы тэлефонны званок ад Міколы Чарняўскага. Часта званю яму сам, бо добра ведаю што ён вельмі цікавы суразмоўца на любую злабадзённую тэму: пра жыццё, пра літаратуру, пра спорт… Мікалай Мікалаевіч заўсёды добразычліва параіць, падкажа, падзеліцца з табой сваім багатым вопытам.

Упершыню мы сустрэліся з ім на радыёперадачы «Першыя сцяжынкі», куды пісьменнік запрасіў мяне, яшчэ зялёнага першакурсніка, каб я пачытаў у мікрафон свае вершы. Праўда, за плячыма я мяне ўжо былі публікацыі ў рэспубліканскім друку, у тым ліку — у часопісе «Маладосць» і ў штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва». З гэтага і пачалося наша шматгадовае сяброўства.

Потым, працуючы ў выдавецтвах, мне пашчасціла быць рэдактарам многіх кніг Міколы Чарняўскага, першаму з чытачоў адкрываць для сябе і іншых неруш яго сакавітага слова. Мы нават працавалі разам з ім у рэдакцыі часопіса «Вясёлка», хадзілі на пасяджэнні секцыі дзіцячай літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Але асабліва запамяталася наша паездка на маю малую радзіму на свята паэзіі і музыкі «Зэльвенскія сакавіны — 2016». У складзе пісьменніцкага дэсанту акрамя Міколы Чарняўскага і мяне былі таксама спявак Вячаслаў Статкевіч — зяць паэта, пісьменнікі Генадзь Аўласенка і Яна Явіч.

Шчыра і натхнёна Мікалай Мікалаевіч чытаў свае лірычныя вершы, дзяліўся з моладдзю юнацкімі згадкамі. Перапоўненая зала раённага Дома культуры вітала любімага паэта працяглымі апладысментамі. Многія чытачы выказалі жаданне сфатаграфавацца з пісьменнікам на памяць.

На адной з юбілейных вечарын Міколы Чарняўскага ў Доме літаратара народны артыст Беларусі кампазітар Эдуард Зарыцкі падзяліўся цікавай згадкай. Аднойчы пасля іх сумеснага выступлення юная чытачка запытала ў паэта: «Колькі вам гадоў?»

«А колькі ты дасі?» — пытаннем на пытанне адказаў творца.

«Сто!» — не марудзячы ні хвіліны, вымавіла дзяўчынка.

Вось і мы, калегі па творчасці і сябры пісьменніка, жадаем заслужанаму дзеячу культуры Рэспублікі Беларусь Міколу Чарняўскаму не меней творчых гадоў. І чакаем ад яго новых цудоўных кніг і радасных сустрэч.

«Няхай заўжды вядуць жыццёвай сцежкай // Любоў, краса, дабро ва ўсім і ўсмешка!» — зіхацяць словы-пажаданні на падпісанай мне кнізе ад шаноўнага пісьменніка, мэтра беларускай літаратуры Міколы Чарняўскага. Мікалай Мікалаевіч заўсёды ўсміхаецца, прытым больш вачыма, быццам знутры. Пэўна, у гэтым сакрэт яго даўгалецця?! 16 студзеня Мікола Чарняўскі адзначыць 80-гадовы юбілей і 65-годдзе творчай дзейнасці. Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, выдатнік асветы, выдатнік друку, лаўрэат шматлікіх літаратурных прэмій, ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Мікалай Мікалаевіч мае сотні кніг і прызнанне, ідзе па творчым шляху з адкрытасцю і прыязнасцю, якія і падарылі мне ўдачу паразмаўляць з мэтрам і даведацца пра першыя яго крокі і нават расчараванні. Чуйнае сэрца пісьменніка клапатліва зберагло творчыя ўспаміны. І нам, маладым, карысна сёння даведацца пра залацінкі творчасці майстра.

Уся справа ва... усмешцы

— Мікалай Мікалаевіч, як прыгожа падпісалі мне кнігу! Каліграфія!

— Гэта ўсё ад урокаў чыстапісання ў школе. Пісалі пёрамі, раўняючыся на касыя лінейкі. Выводзіў, стараўся — пяцёрку зарабіць хочацца, таму абы-як не напішаш. Пёры былі адмысловыя, трэба націскаць — каб спачатку тоненька, потым патаўсцей.

— Такое старанне — прыкмета літаратурнай будучыні?

— Па сутнасці, я вучыўся няблага і па іншых прадметах. Але больш падабалася літаратура, лёгка даваліся вершы на памяць. Я шмат чытаў. Хаця якой была пасляваенная школьная бібліятэка!.. Сямігодка. У канцы калідора стаялі дзве-тры шафы. Хто старэйшы — таму таўсцейшую кніжку давалі. Сельская бібліятэка называлася хатай-чытальняй: год-два-тры знаходзілася ў пэўнай хаце, і гаспадарам штосьці плацілі за гэта, вядома. У хатах-чытальнях было ўсё: ад газет, часопісаў, кніг да гармонікаў, балалаек, гітар, даміно, шахмат. Як кажуць, культурны цэнтр. Клуба не было. І калі прывозілі кіно, паказвалі па хатах, потым у школе. У адным канцы калідора вешалі палатно, а ў другім ставілі апаратуру. Малыя садзіліся на падлозе. Калі я сядзеў на падлозе пад палатном, здавалася, танк ехаў прама на мяне. Які піск падымалі! Для дарослых білет — 2.50, дзецям — рубель. Калі на кінасеанс трапіць не ўдавалася, глядзелі праз вокны з вуліцы — нічога, што выява адлюстроўвалася ў акне дагары нагамі. Помню Тарзана, які з кракадзіламі біўся...

— Ваш лёс вызначыла газета «Піянер Беларусі»…

— У 1960 годзе, калі мяне туды ўзялі на працу, яна выходзіла большым тыражом, чым «Зорька», — каля 500 тысяч экэмпляраў. У «Піянеры Беларусі» 18 ліпеня 1958 года з'явіўся мой першы верш «Васілёк». Гэта было пры Хведару Жычку. Каго ні вазьмі з майго пакалення — усе пачыналі з газеты «Піянер Беларусі». Як, напрыклад, Казімір Камейша. Я ўжо працаваў у рэдакцыі, калі ён даслаў свой верш «Крыгаход». А які з мяне тады яшчэ быў рэдактар — мне самому толькі 18 гадоў! А пісем прыходзіла шмат: у год рэдакцыі «Піянера Беларусі» і «Зорьки» атрымлівалі па 10—12 тысяч пісем. У панядзелак — па два мяшкі, і трэба даваць адказы. Таму ў сераду, калі вярсталіся, — гарачая пара. Я адказваў на пісьмы, але пасля мяне іх чытаў, штосьці падпраўляў Васіль Зуёнак. І вось прыходзіць верш «Крыгаход» з цудоўнымі вобразамі. Я паказаў Зуёнку, і вырашылі яго адкласці, бо ўжо было лета. І наступнай вясной — 1961 года — мы гэты верш надрукавалі. Так адбылася першая публікацыя ў рэспубліканскім друку Казіміра Камейшы. Я пісаў адказ, таму яму як хросны бацька. А мы ж з ім аднагодкі, толькі я са студзеня, а ён — са снежня. Адсюль, з «Піянера Беларусі», і Алесь Бадак, і Алесь Разанаў, і Міхась Зарэмба пачыналі. Дарэчы, Міхась Зарэмба хоць празаік, але пачынаў як паэт. У «Піянеры Беларусі» быў надрукаваны яго верш «Пралеска». Калі мы сустрэліся ў 1960 годзе (ён паступаў на аддзяленне журналістыкі), у «Маладосці» яго надрукаваў Пімен Панчанка. Разам ездзілі на пасяджэнні літаб'яднання ў «Чырвоную змену». Ён яшчэ вучыўся, але яго ўзялі ў «Піянер Беларусі» працаваць. І потым Міхась застаўся там на 20 з нечым гадоў. Але, здавалася, адышоў ад паэзіі, ад літаратурнай творчасці, яго больш захапіла журналістыка. Калі я працаваў у «Бярозцы», пачаў яго крыху тузаць, і ён перайшоў на апавяданні, аповесці — надрукавалі дзве яго аповесці. Так ён і стаў цікавым празаікам.

— Можа, для літаратурных жанраў трэба саспець?

— Многія пісьменнікі прайшлі праз газеты: хто — у «Чырвонай змене», хто — у «Звяздзе», хто — у «Калгаснай паўдзе». І ў тым і адрозненне, што газетная мова — іншая. Аднак усё залежыць ад аўтара: калі ён добра валодае словам, то ў яго і газетная мова выразная. Вось, напрыкалад, Міхась Вышынскі кожнае слова быццам смакаваў. Ён таксама канчаў беларускае аддзяленне філфака. Проза пачатку 1960-х гадоў пайшла арыгінальная (Салаухін і іншыя). Ён яе чытаў з алоўкам і словы сакавітыя выпісваў, часам, можа, нават гэтым злоўжываў. Пташнікава чытаў, а ў яго было шмат дыялектызмаў. У газеты пісьменнікі дасылалі нарысы. Як, напрыклад, паэт Васіль Макарэвіч. Нарысы ў яго — як тая самая проза. Ці той жа Валянцін Мыслівец: нарысы атрымліваліся мастацкія. Паэт Антон Бялевіч, Тарас Хадкевіч, напрыклад, былі нарысістамі ў «Звяздзе», нават пасада такая была ў газеце — нарысіст. А так звычайным журналістам няма калі думаць, шліфаваць. Вечарам прыехаў з камандзіроўкі — а раніцай аддай тэкст.

— А каб пісаць прозу, трэба над ёй бясконца сядзець, карпець? Пэўна, так проста яна не даецца...

— Проза, вядома, патрабуе больш увагі, чым, напрыклад, паэзія. Вершы можаш думаць на хаду. А над прозай трэба сядзець, на хаду — толькі схему сюжэта прадумаць. Цяперашняя проза пайшла камп'ютарная.

Запрашаем на юбілейную сустрэчу з пісьменнікам, лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя Янкі Маўра, прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, літаратурнай прэміі «Залаты Купідон», выдатнікам народнай асветы, выдатнікам друку, заслужаным дзеячам культуры Рэспублікі Беларусь Міколам ЧАРНЯЎСКІМ, прысвечаную 80-годдзю з дня нараджэння і 65-годдзю творчай дзейнасці. Сустрэча адбудзецца 19 студзеня ў Доме літаратара (вул. Фрунзэ, 5) у 17.00.

— Зараз камп'ютарная праграма можа сама напісаць твор. І ці патрэбен пісьменнік? Ці магчыма такое ў будучыні?

— Усё можа быць, толькі не ведаю, як іх чытаць будзеце… Хай розум занадта вялікі, але ў камп'ютара няма сэрца, жывога, трапяткога, чуйнага да ўсяго. Ён халодны. Можа, сюжэт і будзе. Але і толькі. Чаму захоўваюцца арыгіналы твораў пісьменнікаў, рукапісы?! Калі складаеш на паперы і папраўляеш рукой — тут жа рэдагуеш, бачны ход думкі. На паперы неяк бліжэй, гэта адпавядае тваёй душы, бліжэй да сэрца. Як я дзецям расказваю: кніжку чытаеш — пад падушку пакладзеш. А яны: «Дык і смартфон пакладзеш!» — «Смартфон халодны, — парырую, — на смартфоне не паспіш». Зараз ва ўсім свеце часцей сталі вяртацца да спаконвечнага, да папяровай кнігі. Яшчэ пераканаўся: рызыкоўна з дзецьмі абыходзіцца з дыдактызмам: «Так не рабі». Яны ўпарты — і зробяць наадварот. Лепей з гумарам апісаць смешную гісторыю — хутчэй задумаецца. Сатыра і гумар больш выхаваўчыя, чым строгая дыдактыка. Я адпрацаваў 22 гады ў «Бярозцы», і гэтаму там удзялялі вялікую ўвагу. Вершы з усмешкай цяплейшыя.

Мікола Чарняўскі.

— Вы не засяроджваліся толькі на дзіцячай тэматыцы...

— Мяне змалку цікавіла тэма вайны. Яшчэ калі быў школьнікам, у нас у вёсцы жыло шмат тых, хто быў у партызанах, ваяваў. У нас хата была без перагародак, суцэльнае памяшканне, у адрозненне ад іншых, і таму да нас часта вясковыя хлопцы і дзяўчаты прасіліся ладзіць танцы — зручна, месца многа. Збіраліся мужыкі: вясной, бывала, на прызбе сядалі. Зімой прыходзілі ў хату, бліжэй да печкі чыгуннай. На прыпечку ставілі газоўку і курылі, расказвалі адзін аднаму, успаміналі. А я на печы сядзеў і слухаў.

А якраз у «Піянеры Беларусі» была аб'яўлена акцыя «Юныя разведчыкі», каб запісвалі ўспаміны, цікавыя гісторыі. І я гэта рабіў. Надрукавалі. У нашым раёне быў Лозаўскі бой. Цяпер ён апісаны ў энцыклапедыі. І я ведаў падрабязнасці: як наступалі немцы, як ад іх адбіваліся, як загінуў камандзір брыгады — усё з сапраўдных аповедаў відавочцаў. Партызан Міша Рыпінскі, сын нашай суседкі, аднагодак майго старэйшага брата, загінуў у 1945 годзе ў Германіі. Я і пра яго напісаў. Адправіў на конкурс. Хведар Жычка падрыхтаваў і змясціў у кнігу «Наш родны край» разам з творамі Міколы Маляўкі, Мішы Зарэмбы, Марыі Шаўчонак, Міхася Болсуна, дый іншых. Кніга, дзе сабрана творчасць юных карэспандэнтаў, выйшла ў 1959 годзе. Такім чынам, расказаныя гісторыі відавочцаў я пасылаў у рэдакцыі. На жаль, арыгіналаў не засталося. Самае цікавае — як раней ставіліся ў рэдакцыях да сваіх юнкараў. Было гэта на маё 60-годдзе. Прыходзіць у «Вясёлку» Хведар Жычка. Павіншаваў, пагаварылі, а потым дае мне аркушы. Гляджу — і дзіву даюся: гэта ж мой рукапіс! Пра Мішу Рыпінскага, яшчэ іншыя мае запісы пра вайну, яго пісьмо пра тое, што будзе змешчана публікацыя (другі раз). Уяві: захаваць з 1959 года (а мне 60 было ў 2003-м). Гэта адзінае, што засталося з маіх арыгіналаў, пачатку творчасці.

Аднойчы ў «Чырвонай змене» я прачытаў пра подзвіг аднаго хлопца — Міхася Усоскага з Барысаўскага раёна, партызана брыгады «Дзядзькі Колі». Пра яго пісаў былы рэдактар падпольнай газеты Даніла Капыткоў, расказваў пра яго сям'ю, як загінуў. І мяне гэта так кранула, што ўзяўся і напісаў паэму «Апошні бой». Паслаў Данілу Капыткову, ён пачытаў, яна выйшла ў 1967 годзе. Яе пахваліў у часопісе «Беларусь» Мікола Хведаровіч. І якраз у мой дзень нараджэння, 25 гадоў, у газеце «Літаратура і мастацтва» выходзіць рэцэнзія на маю кніжку. Поўны натхнення і настрою, разгортваю — і... аблом: «Інфармацыйна, без пачуцця». Подпіс унізе — Р. Барута. Я адразу здагадаўся, хто гэта — Рыгор Бярозкін. Ён тады працаваў у «ЛіМе» ў аддзеле крытыкі. Я, калі заходзіў, бачыў у яго на стале сваю кнігу. Канечне, было крыўдна за крытыку. Але больш — за тое, што Рыгор Бярозкін схаваўся за псеўданімам. А ён тады быў мэтрам, вельмі сур'ёзным крытыкам.

— На вашу думку, ён справядліва пакрытыкаваў?

— Канешне, справядліва! Ён пісаў рэцэнзіі на сур'ёзных нашых класікаў. Лічыўся адным з найлепшых крытыкаў, стаў прызнаным яшчэ ў 1930-я гады, калі яму было 17. У 1939-м у 21 год яго прынялі ў Саюз пісьменнікаў.

— Пасля крытыкі не апусціліся рукі?

— Калі ўжо потым я сваю паэму перачытваў раз, другі, самому стала соромна і крыўдна: сапраўды прымітыў, сапраўды інфармацыйна, без жыцця. Мая другая паэма — «Навечна з сонцам» — пра Антона Губарава, падпольшчыка-партызана са Жлобіна, земляка. Яго, параненага на чыгуначным палатне, дзе ён падрываў цягнік, узялі ў палон немцы. Ён вёў сябе дзёрзка, і яго закапалі жыўцом. Потым з'явілася ідэя выдаць кнігу, бо хацелася напісаць яшчэ і пра Марата Казлова, таксама юнага 12-гадовага падпольшчыка з Быхаўскага раёна. У разведцы яго схапілі, катавалі, вушы, нос адрэзалі, рукі ламалі і зорку на грудзях яшчэ выразалі. Ды ён усё мужна вытрываў. І я вырашыў першую сваю паэму «Апошні бой» перапісаць нанова: што выкрасліў, што дабавіў, рыфмы падчысціў, яна павялічылася па аб'ёме. Такім чынам, вярнуўся да яе праз 30 гадоў, уявіце! Ужо меў вопыт, быў спрактыкаваны. І гэтым разам соромна не было.

— Як лічыце, што чалавеку дапамагае жыць?

— Сама патрэба жыць. Будзеш жыць — будзеш нешта рабіць. А каб нешта рабіць — трэба жыць. На радыё я амаль 30 гадоў вёў літаратурную перадачу «Першыя сцяжынкі» — колькі пералапацію! Амаль тры дзясяткі гадоў з'яўляюся кіраўніком літсуполкі «Купалінка» Мінскага раёна: колькі праз мае рукі прайшло юнацкай творчасці!

Я па сёння помню почырк нашых літаратараў, напрыклад, Уладзіміра Мазго, Алеся Бадака, якія мне пісалі. Уладзімір Мазго першы верш надрукаваў у «Піянеры Беларусі», а потым ужо ў «Бярозцы», як і Алесь Бадак. Па сёння памятаю яго празаічныя эцюды. Лена Масла першую казку надрукавала ў 5 класе ў «Бярозцы». Калі ўсіх узяць, у каго першая публікацыя была ў «Бярозцы», — дык, лічы, палова пісьменніцкага саюза. З многімі калегамі звёў мяне творчы лёс, за што шчыра ўдзячны.

— Дзякуй, Мікалай Мікалаевіч, за цёплую, прыемную размову! З днём нараджэння! Здароўя, міру, радасці і новых крылатых ідэй! Да сустрэчы на вашым юбілейным творчым вечары!

Гутарыла Наталля СВЯТЛОВА, фота аўтара

з пісьменніцкага блакнота

Блізкі і далёкі горад Таш

Борт Мінск — Ташкент з васількамі на фюзеляжы лёгка адарваўся ад зямлі. Наперадзе Форум творчай і навуковай інтэлігенцыі СНД, работа ў профільнай секцыі, прэзентацыя тома анталогіі прозы, сустрэча з аўтарамі і перакладчыкамі розных краін, абмеркаванне далейшага ўзаемадзеяння, цікавыя літаратурныя знаёмствы.

Зярняткі сланечніка

А пакуль… у салоне самалёта гаманкія каларытныя пасажыры, кінулі спрэчкі, валтузню, самаарганізаваліся і прыціхлі. І ў позірках чорных вачэй зараз чыталася непасрэдная цікавасць да размовы нашай троіцы. І сапраўды, як спелыя зярняткі ў сланечніку! Так падобраму ахрысціла спадарожнікаў Алена Стэльмах, кіраўнік нашай творчай дэлегацыі.

Размову не перапынілі ні ўзлёт, ні пасадка. Так і прагаварылі да самага Ташкента. Калі больш дакладна, гаварыў Зіновій Кірылавіч Прыгодзіч, які трапіў на чатыры гадзіны да мяне ў суседзі. Маштаб асобы, мэтанакіраванасць, жыццёва-творчыя варункі, глыбіннае бачанне працэсаў уражваюць, а эмоцыі яшчэ патрабуюць пэўнага пераасэнсавання.

Гаварылі і пра форум. Без асаблівага хвалявання абмяркоўвалі рабочыя моманты. А чаго хвалявацца, калі ў запасе два дні, а побач — бліскучы арганізатар — Алена Анатольеўна?! Ужо толькі прысутнасць яе пісьменнікамі ўспрымаецца як гарантаваны знак якасці любога мерапрыемства.

А вось і першае ўражанне ад сустрэчы з горадам — незвычайны тонкі кветкавы пах. І ноч, як у нас, і маразы, і людзі, і машыны, а паветра такое, быццам тут хвіліну назад босая вясна з верша Анатоля Зэкава танчыла. Кагнітыўны дысананс: горад Таш ці, як раней нызывалі, Шы, што значыць камень, а водар — кветкавы.

Ташкенцкае метро

Ташкенцкая падземка выручыла двойчы. Першы раз, калі, нібыта сляпыя кацяняты, у поцемках без мабільнай сувязі ды з драбязой у кішэнях шукалі дарогу ў гатэль. Нагода, якая выцягнула нас пасля пералёту на край свету, была так сабе, але што зробіш — жыццё ўносіць карэктывы. Сваіх не кідаем! І толькі ўдзень жахнуліся: паміж праезнай і пешаходнай часткай на месцы звыклых бардзюраў у горадзе даволі глыбокія арыкі. Але ж не прапалі. Даверыліся і пайшлі ў той бок, куды знакамі накіраваў прахожы.

Фота з сайта lovepium.ru

Другі раз падземка выручыла падчас знаёмства з горадам. Хацелася той невялічкі адрэзак часу скарыстаць з найбольшай карысцю. Каб усё адразу: і горад пабачыць, і з культурнымі традыцямі жыхароў пазнаёміцца. Позірк скіраваліся на Сярэднеазіяцкі цэнтр плову. Падземны цягнік умомант бы дамчаў дзвюх ранішніх вандроўніц да прыпынку Шахрыстон. Але ці ўстаяў бы хто на нашым месцы, каб не падзівіцца выключнаму густу метрабудаўнікоў, што аздаблялі станцыі яшчэ за савецкім часам?! Казачныя сюжэты, гарманічныя, запамінальныя, не вельмі сапсаваныя сучаснай рэкламай.

Плоў — усяму галава

Плоў для ўзбека — што для беларуса дранікі: ежа на ўсе выпадкі жыцця, хочаш еш сам, хочаш — частуй гасцей.

Азіяцкі Цэнтр плову — знакавае месца для жыхароў горада, месца сямейнага адпачынку, сустрэчы з сябрамі і сваякамі. А для такіх, як мы, цікаўных гасцей, яшчэ і магчымасць пабачыць на свае вочы працэс прыгатавання, ад «а» да «я». Побач з павільёнам месціцца адкрытая «кухня». На лобным месцы вісяць толькі што разабраныя тушы, вакол іх — адны мужчыны. Наогул, там былі толькі мужчыны. Мы пакружылі вакол дзвюх вялікіх печак, дзе ў казанах даходзіў плоў, схаваны дзясяткам круглых падносаў, паглядзелі на працэс прыгатавання ляпёшак і ціхенька выйшлі.

Яшчэ раніца, а столік у вялікай зале, разлічанай на 500 месцаў, знайшлі дзякуючы «кампактнасці» кампаніі. Дакладней, мы былі адзіныя ў такім складзе. Вакол — вялікія сем'і, а ўвесь клопат за адпачынак бяруць на сябе маладыя мужчыны роду. І спачувальныя погляды ўсходніх прыгажунь у наш бок усё ж такі зачапілі, але настрой не сапсавалі. Старэйшыя ж прадстаўніцы, прыбраныя ў шыкоўныя нацыянальныя ці то халаты, ці то паліто, плылі як царыцы і нікога не заўважалі. Канешне, права захапляцца іх становішчам нам велікадушна было падорана. І я ледзь вочы не зламала, прыняўшы ўмовы гульні. Як годна можна сустрэць узрост! І як шмат страцілі мы свайго самабытнага нацыянальнага — так легкадумна абязлічыліся. І дзеля чаго?

Але вернемся да плову. Уяўленне пра гэтую страву ў асноўнай часткі еўрапейскага насельніцтва, да якой адносім сябе і мы, насамрэч, вельмі памылковае. Па-першае, плоў — гэта не каша з мясам, а, калі хочаце, своеасаблівы лад жыцця, вобраз думак — Паэзія, адным словам.

Бліжэй да Бога

Усход — справа тонкая. Паверыш тут, што выраз не толькі трапны, але яшчэ і выверaны на практыцы. Бо ўсе нашы жаданні, выказаныя і тыя, што заморскімі птушкамі песціліся ў раі душы, спраўдзіліся. Праўда, вельмі па-рознаму, часам з прыгодамі, вострасюжэтна. Хацелі — атрымайце! З новым досведам прыйшлося вучыцца быць асцярожнымі ў жаданнях.

Разуменне сябе — выдатная рэч: пачынаеш жыць «цяпер». І таму адпадае патрэба быць прарокам ці супераналітыкам — проста жыві і будзь шчаслівы!

Алайскі базар

На вуліцы мінус, сапраўдная каляндарная зіма, але ўпартае сляпучае сонца збівае з панталыку. Твая істота падпадае пад магію 8 сакавіка, і душа на аўтамаце патрабуе мімоз.

Алайскі базар і сустрэў нас у такім настроі. З голаду там дакладна не памрэш, хутчэй наадварот. На кожным прылаўку настойліва прапаноўвалі прысмакі. І мы часталіся. Не ад сваёй недалікатнасці — зусім не. А таму, што беларуская гаспадыня прывыкла да фаршыраванага перцу ці на крайні выпадак (калі пашчасціла быць жонкай не паэта, а рыбака) — фаршыраванага шчупака. А тут! Фаршыраваны нейкай смакатой з чатырох складнікаў чарнасліў! Атрымаўшы сонечны ўдар усходняй гасціннасці, наша памяць пазнавала толькі разынкі і часам арэшкі, калі тыя былі ў шкарлупіне.

Гэта пасля, ужо асвоіўшыся, выбралі аднаго простага прадаўца, вельмі падобнага да беларускага вясковага фермера. Вялікі, як мядзведзь, Джафар ужо здалёк гучна вітаў сваіх дарагіх гасцей, разліваў па кубачках пахкую гарбату з горных зёлак і выстаўляў каробкі, мяхі і пасудзіны з пачастункамі на прылавак.

Адкрытасць, узаемапавага і цікавасць

Цяперашні форум з двумастамі дэлегатамі з Беларусі, Арменіі, Азербайджана, Казахстана, Кыргызстана, Туркменістана, Узбекістана і Расіі сам па сабе ўжо сведчыць аб вялікім жаданні ўзмацняць узаемадзеянне і мацаваць сяброўства паміж народамі.

Урачыстае адкрыццё форуму «Гуманітарнае супрацоўніцтва — вопыт трыццаці гадоў і перспектывы развіцця» адбылося 12 снежня. Першы раз высокі сход прымала сталіца Узбекістана Ташкент. У праграме форуму — узнагароджанне лаўрэатаў, панэльныя сустрэчы, работа секцый, прэзентацыя анталогіі і выступленне маладзёжнага сімфанічнага аркестра.

Большасць мерапрыемстваў шырока асвятлялася СМІ. Спынюся на інфармацыйнай падзеі, па якой пільнае журналісцкае вока прайшлося павярхоўна. Можа, з-за значнасці папярэдніх з маштабам іх медыйных асоб. Так ці інакш, але сустрэча аўтараў і перакладчыкаў праходзіла два дні запар у Самаркандскай зале пры атэлі.

Кожны даклад, які пасля плаўна пераходзіў у дэбаты і размову пра сваё — тэма асобнай гаворкі. Радавала, што не было дэпрэсіўнай бесперспектыўнасці ў далейшых узаемаадносінах, трансліраваліся адкрытасць, узаемапавага і цікавасць. Была і болевая кропка, адна на ўсіх. Яна датычылася пісьменніка, яго нерэалізаванасці. Думаю, разводзіць мудрагеліства пра вертыкаль «выдавецтва — пісьменнік — прэмія», літаратуршчыну, нізкі ўзровень ганарараў, а бывае, і твораў асобных відных пісьменнікаў, раздутасць творчых саюзаў не мае сэнсу — усе гэтыя і многія іншыя неназваныя кампаненты з'яўляюцца вытворнымі з нерэалізаванасці. Атрымліваецца, асэнсаваны пошук пісьменнікам свайго месца ў грамадстве, жыцці і літаратуры і стаяў над усім апошнія 30 гадоў?

Фота з сайта silkroadexpress.uz

Алайскі базар.

Жывая даверлівая гутарка паміж творчымі дэлегацыямі ад кожнай з нацыянальных літаратур — тое, дзеля чаго варта было пераадолець тысячы кіламетраў. Менавіта ў гэты час пракладаліся трывалыя масты сяброўства і доўгатэрміновага супрацоўніцтва. Наперадзе — пераклады, анлайн-знаёмствы і сустрэчы з сучаснымі пісьменнікамі блізкага і далёкага замежжа.

Адзначу, што цёплае сяброўскае стаўленне Таджыкскай дэлегацыі перайшло да мяне, беларускі, дзякуючы папярэдняй нястомнай працы Алеся Мікалаевіча Карлюкевіча.

Акын і яго вялікае каханне

Не адкрыю Амерыкі, калі скажу, што ўсё самае цікавае адзін пра аднаго ў такіх паездках мы дазнаёмся ў апошні вечар перад ад'ездам. Пакіну за сабой права не называць імя гэтага чалавека, сапраўднага мужчыны і сапраўднага паэта. Скажу толькі, што зараз ён адзін з самых папулярных сучасных акынаў у сваёй краіне.

Калісьці, у юнацкія гады, у песняра перад самым вяселлем укралі яго каханую. І дзяўчына перад тым, як пераступіць парог чужога дома, здзейсніла абрад, пасля якога назад дарогі не было. Акын знайшоў у сабе сілы і прыняў запрашэнне на вяселле. Увесь час, пакуль ён спяваў пра прыгажосць маладой, з яго вачэй ліліся буйныя слёзы. Падарыў латарэйны білет з выйгрышам аўтамабіля і пакінуў свята. Доўгія дзесяць гадоў хлопец перажываў нешчаслівае каханне і складаў песні, каб паменшыць сардэчны боль. Рана загаілася, у акына зараз вялікая сям'я. Але ў час яго вяселля былая каханая адкрылася. Яна даведалася, што найлепшыя творы пішуцца, калі ў паэта параненае сэрца, і ахвяравала сабой.

Палеская сюіта

На сцэне Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра імя Алішэра Наваі выступленне зводнага маладзёжнага сімфанічнага аркестра СНД. Наперадзе — выспупленне і легендарнага артыста Палада Бюльбюль аглы. Мастацтва дырыжыравання нагадвае танец агню. Зала цёпла сустракае вядомыя музычныя творы краін Садружнасці. І вось мілавідная вядучая прадстаўляе наступны нумар: Яўген Глебаў «Палеская сюіта». Бачу, колькі задавальнення і радасці дае некаторым музыкантам само выкананне твора, а пасля — гром авацый. Зразумела, што такі прыём не толькі за віртуознасць. Як прыемна і ганарова адчуваць сябе часткай краіны!

Іна ФРАЛОВА

Згода рэальнага і казачнага

Шэраг святочных выставак Нацыянальнага мастацкага музея ў хуткім часе скончыць працу. Зазірнулі на некаторыя з іх, каб расказаць, як музей адзначыў Новы год і Каляды, на якія значныя даты скіраваў увагу грамадскасці і чым прывабліваў жыхароў і гасцей сталіцы.

Абрам Архіпаў «Сялянская дзяўчына», 1917 г.

Адна з найбольш маштабных (і па задуме, і па напаўненні) экспазіцый прысвечана 160-годдзю выдатнага мастака Абрама Архіпава і 120-годдзю з даты заснавання «Саюза рускіх мастакоў» — найбуйнейшай выставачнай творчай арганізацыі ў гісторыі рускай мастацкай культуры першай чвэрці XX стагоддзя. Прыгажосць прыроды, асаблівасці тагачаснай рэчаіснасці былі ў цэнтры ўвагі мастакоў, аднак, калі браць шырэй, іх болей цікавіла гісторыя, карані тых ці іншых традыцый. Натуральна, сённяшняя прадстаўленыя творы ў пэўнай ступені падаюцца архаікай. Тут гаворка і пра матывы, што пануюць у большасці твораў, і пра стылявую накіраванасць, і пра асаблівасці адлюстраванага. Аднак гэтым выстаўка і цікавая. «Масква. Крэмль прыцемкам» (1910-я) Канстанціна Юона, «Іван Каліта абыходзіць дубовыя сцены Крэмніка ў 1340 годзе. (Імаверны від Масквы пры Іване Каліце.)» (1917) Апалінарыя Васняцова, «Да вянца. Баярскае вяселле» (1910) Леанарда Туржанскага — найбольш выразныя і яркія работы канкрэтнай тэматыкі.

На выстаўцы хапае твораў, якія ўяўляюць цікавасць для даследчыкаў і гледачоў. Між тым вывучаеш, напрыклад, «Вясну ў вёсцы» (год стварэння не пазначаны) Аляксея Сцяпанава (1858—1923), і такія катэгорыі, як актуальнасць, своечасовасць, надзённасць, жаданне згадваць і тым больш разважаць пра іх знікае. Адлюстраваны ўсё тыя ж маркота, запусценне, шэрасць. Для пазнавання сучасным гледачом нават ніводнага колеру змяняць не трэба.

Экспазіцыю склалі творы жывапісу, графікі і скульптуры са збору НММ. Творчасць галоўнага героя — Абрама Архіпава — прадстаўлена ў асобнай зале. Вядома, што ў зборы музея знаходзіцца невялікая калекцыя мастака, якая налічвае шаснаццаць работ і ахоплівае перыяд з 80-х гадоў XIX стагоддзя да другой паловы 20-х гадоў мінулага. Упершыню глядач бачыць яе цалкам. «Вясковая паэзія», як сам аўтар называў штодзённасць жыцця вёскі («Раданіца», першая палова 1890-х; «Зваротны», 1896), захапленне сціпласцю прыроды («Селянін, які сядзіць каля ракі», 1890-я; «Рыбак», 1900-я), чалавек і яго лёс («Маладая сялянка ў чырвоным», 1925; «Дзяўчына, якая ўсміхаецца», 1920-я; «Сялянская дзяўчына», 1917; «У бальніцы», 1890-я) — той тэматычны абсяг, які мы назіраем у творчасці майстра.

Станіслаў Жукоўскі «Першыя прадвеснікі вясны. Падснежнікі», 1910 г.

Дапаўняюць экспазіцыю рэдкія выданні пачатку XX стагоддзя і каталогі выставак аб'яднання. Убачыць усе гэтыя экспанаты можна да 22 студзеня.

Валянціна Шоба. З цыкла «Упрыгажэнні на Каляды» (2022).

Святочны настрой, бясспрэчна, стварае персанальная выстаўка гродзенскай мастачкі Валянціны Шобы «Калядныя карункі» (працуе да 23 студзеня). Прадстаўлена каля 50 графічных работ майстра, большасць з якіх створана сёлета спецыяльна для праекта ў Нацыянальным мастацкім музеі, як, напрыклад, цыклы «Упрыгажэнні на Каляды» і «Дванаццаць».

Харство, міф, таямнічасць, казачнасць, крышачку магіі — усё гэта злучыла ў сваёй творчасці Валянціна Шоба. За ўсім пералічаным хаваюцца вера ў цуд, пошук доказаў чараўніцтва, імкненне расказаць пра асабістыя сакрэты. Графіка творцы надзвычай гарманічная, нягледзячы на наўмысную неўраўнаважанасць, схільнасць да пэўнага абстрагавання. Між іншым у ёй счытваецца поўнае прыняцце навакольнага свету, у якім можа быць столькі спякоты і холаду, празрыстасці і туману, святла і цемры… Найбольш ярка гэтыя станы перакрыжоўваюцца, ствараюць асаблівую сімфонію ў цыкле «Зімовыя домікі» (2018—2022). Тут аўтар імкнецца прывесці да згоды казку і рэальнасць, ствараючы тым самым асаблівую прастору пошукаў і знаходак для гледача, што надзвычай важна. Між тым такія неабходныя шуканні ажыццявіць даволі складана — творчасць Валянціны Шобы зусім не простая для ўспрымання: тут напластаванне шматлікіх падтэкстаў, гульня з разнастайнымі карункамі і арнаментамі, зварот да сюжэтаў з паўсядзённасці, у чым выяўляецца эмацыянальнасць і сапраўдная любоў да жыцця, на якое мастачка глядзіць з дзіцячай зачараванасцю… Ці гэта толькі прыгажосць у вачах таго, хто глядзіць?

Трэба адзначыць, экспазіцыі Валянціны Шобы ў Мінску сталі ледзь не традыцыйнымі менавіта ў зімовыя святы. Не першы год гаспадары розных выставачных пляцовак схіляюцца да таго, што атмасферу радасці і шчасця ў самыя цёмныя дні ў годзе здольны прыўнесці якраз работы Валянціны Шобы, нягледзячы на выбраныя ёй колеры, светлыя і натхняльныя. Творца вылучаецца вялікай працавітасцю, таму, відавочна, новыя пошукі і знаходкі не прымусяць сябе чакаць.

Крыху неспадзяванай ў Нацыянальным мастацкім музеі падаецца выстаўка, прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння Аляксандра Карпана. Мастак лічыцца адным з самых таленавітых беларускіх акварэлістаў канца XX — пачатку XXI стагоддзя. Знакаміты прадстаўнік віцебскай школы акварэлі не толькі ствараў, але і выкладаў: выпускнік мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С. Кірава, з канца 1970-х гадоў — яго педагог (выкладаў малюнак, жывапіс і кампазіцыю). Мастак працаваў у розных жанрах, аднак схіляўся — і выстаўка гэта дэманструе — да нацюрморта, пейзажа і партрэта. Вядома, што ў апошнія два дзесяцігоддзі жыцця Аляксандр Карпан атрымаў прызнанне прафесіяналаў і гледачоў на буйных міжнародных акварэльных біенале ў Беларусі і Расіі, Літве, Кітайскай Народнай Рэспубліцы.

Аляксандр Карпан «Вечар», 2006 г.

Творы мастака характарызуюцца выразнасцю і лёгкасцю. Асаблівасць — у эфектнай індывідуальнай манеры акварэльнага пісьма. Відаць, што мастак, нібы навукоўца, дэтальна прадумваў кожную кампазіцыю і шукаў адпаведнае каларыстычнае рашэнне. Калі разважаць пра апошні пункт, адразу згадваюцца нацюрморты: «Белыя хрызантэмы» (2000), «Куст бэзу» (2001), «Астраханскі кавун» (2012), «Вясновы нацюрморт» (2012), «Нацюрморт з гароднінай» (2012), «Маладое віно» (2014), «Белыя півоні» (2015)… Гэта сапраўдны калейдаскоп, праз які можна ўбачыць самае простае і знаёмае, толькі скрозь смугу аўтарскага бачання. Што кідаецца ў вочы — аднолькавы ракурс, падобнае асвятленне адлюстраваных прадметаў, нязменнасць адлегласці паміж імі. У гэтым знарочыстым падабенстве выяўляецца як вернасць абранай канцэпцыі, так і некаторая абмежаванасць.

Нягледзячы на аўтарскую цікавасць да чужой гісторыі і замілаванне краявідамі розных краін (гаворка пра шэраг тэматычных твораў на выстаўцы), мастак быў адданы радзіме — Віцебшчыне (хоць нарадзіўся Аляксандр Карпан ва Украіне). Натуральна, прысутнічаюць творы, прысвечаныя самому Віцебску, а таксама вясковыя пейзажы, якія падаюцца вяршыняй творчасці мастака. Ужо згаданыя выразнасць і лёгкасць, а таксама яснасць, з якімі творца адлюстроўваў прыроду, вельмі зближаюць яго з многімі беларускімі і рускімі мастакамі, асабліва — з Вітольдам Бялыніцкім-Бірулем. Параўнаць і знайсці блізкасць і адрозненні можна на выстаўцы Аляксандра Карпана, якая будзе працаваць да 15 студзеня.

Аляксандр Карпан «Нацюрморт з кошыкам», 2016 г.

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара

Андрэй Карпянкоў «Белы пейзаж», 2022 г.

Адшукаць забытую дарогу

Выстаўка «Зімовая» працуе ў галерэі «Ракурс» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У экспазіцыі прадстаўлены жывапіс і графіка сучаснікаў. Работы аб'яднаны тэмай зімы і святкавання і сабраны разам для таго, каб прадэманстраваць гледачам разнастайную панараму вобразаў, звязаных, апроч іншага, з Новым годам і Калядамі. У розных тэхніках аўтары-ўдзельнікі, сябры Беларускага саюза мастакоў, прадстаўнікі секцый «Верасень», «Традыцыя», «Жывапіс», «Графіка» адлюстравалі сваё бачанне гэтай працяглай пары года. Працуе выстаўка ўсю зіму — ажно да 27 лютага.

Цікавымі ў экспазіцыі падаліся творы, якія можна аднесці да так званага наіўнага мастацтва. Сярод іх — «Снег ідзе» Веранікі Вяткоўскай (2004) і «Зімовы вечар» (2017) Святланы Рыжыкавай, поўныя яркіх колераў і немудрагелістых вобразаў. Сустрэлася і пара «паўабстрактных» твораў, у якіх усю ўвагу на сябе ўзяў, натуральна, колер. У ліку падобных работ ёсць акварэль «Зімнія прыцемкі» Наталлі Шабуневіч: гэта той выпадак, калі задума выдатна супала са спосабам стварэння твора. Між тым змешчаны ў экспазіцыю, здаецца, незапамінальныя сумніўныя кампазіцыі, напрыклад, «Добры леў» (2019) Ірыны Дансковай, «Бег» (2022) Юліі Шамкуць або «Іншы час» (2019) Наталлі Шапавалавай. Работы, відавочна, вельмі асабістыя, але менавіта з-за гэтага меней цікавыя.

Васіль Касцючэнка «Навагодні паднос» (з серыі «Навагоднія вокны»), 2010 г.

Як зразумела, выстаўка атрымалася даволі разнамаснай, аднак кожны зможа знайсці для сябе нешта блізкае. Напрыклад, тым, каму цікава рэлігійная сімволіка, будуць даспадобы работы «Адлюстраванне» (2022) Наталлі Авяр'янавай, «Першы снег» (2022) Вольгі Крупянковай, «На Каляды» (2004) Ігара Марачкіна, «На забытай дарозе» (2021) Паўла Хадаровіча, «Цішыня. Люты. Гродна» (2022) Дзяніса Барсукова. Кожны з твораў — роздум аб ціхім прыстанку, пошук месца сілы, знайсці якое наканавана далёка не ўсім.

Пейзаж на выстаўцы такога роду — самы натуральны складнік. Часцей за ўсё ён вясковы, аднак сустракаюцца і гарадскія, прыродныя, а таксама лірычныя пейзажы. Большасць з твораў гэтага кірунку распавядаюць пра спакой і ціхамірнасць звычайнага зімовага дня нават у тых выпадках, калі маштаб, які ахопліваецца, даволі буйны і колькасць герояў перавышае звыклую для сціплага краявіду колькасць. Яркія прыклады — гульня ў хакей на афорце «Зіма» (год стварэння не пазначаны) Леаніда Марчанкі і мітусня гараджан на акварэлі «Дыялог Мінска і Казімежа» (2022) Багдана Даўгялы. Дзякуючы асаблівасцям кампазіцыі глядач назірае за персанажамі крыху адхілена, бясстрасна, у гэты момант ён схільны да ідэалізацыі ўбачанага, дадумвання і прыхарошвання кантэксту, як гэта часта бывае з падобнымі сюжэтамі савецкага перыяду.

Алена Шлегель «Ёлка. Гофман. Шчаўкунок», 2019 г.

Між тым даволі моцна ў многіх творах гучыць матыў адзіноты: кампазіцый, дзе не выяўлена ніводнага героя, хоць яго (ці іх) прысутнасць напрошваецца, даволі шмат. Замест такіх часта сустракаюцца жывёлы і птушкі, якіх глядацкі погляд нібыта напалохаў, якім нібыта перашкодзіў. Выдатна паказаў такое «ўмяшанне» Леанід Вялічка («Першы снег», «Зімняя казка» 2022 года). І ўсё ж такі самота займае значнае месца ў пейзажах сучаснікаў. Часам яна толькі частка буйной кампазіцыі, а недзе апаноўвае ўсё палатно. А можа, і трэба паглыбіцца ў гэты стан, адчуць усе вартасці і недахопы знаходжання ў ім, паблукаць па тых сцежках, якія настойліва прапаноўваюць нам многія айчынныя мастакі і знайсці адказы на пытанні, якія падаюцца вырашанымі?

Многія карціны на выстаўцы «Зімовая» адлюстроўваюць першы снег — вобраз, які дорыць надзею на новае і лепшае. Снег на вачах хавае тое, што надакучыла, пазбаўляе вострых вуглоў, тоіць у дальняй шафцы ўсё недарэчнае, крыўднае і несправядлівае. Так, ён дапамагае настроіцца на іншы лад, толькі варта не забываць (і беларускія зімы пра гэта ўпарта нагадваюць): калі снег кладзецца на гарады і вёскі, на бляклыя рэшткі зелені і тонкі лёд азёр, ён нядоўга застаецца такім жа ідэальным, як на карціне.

Яўгенія ШЫЦЬКА

(Ма)розныя гісторыі

У Нацыянальнай бібліятэцы аматараў выяўленчага мастацтва чакаюць не толькі на выстаўцы «Зімовая». У галерэі аглядная пляцоўкі (22 паверх) да 24 студзеня экспануецца «Зімовая панарама», прымеркаваная да навагодніх свят. Мэта — падзяліцца добрым настроем, падарыць святочную атмасферу. Дэманструюцца жывапіс, акварэль, пастэль і графіка 14 сучасных аўтараў — членаў Беларускага саюза мастакоў. Некаторыя з іх прадставілі свае творы і ў галерэі «Ракурс».

Сяргей Шыла «Сустрэча», 2012 г.

Натуральна, як і ў папярэднім выпадку, даволі шмат месца на выстаўцы «Зімовая панарама» займае традыцыйны пейзаж: прадстаўлены карціны прыкметных сучасных мастакоў, чыя творчасць заўсёды прыцягвае ўвагу. Так, сустракаюць гледача акварэлі Вячаслава Паўлаўца, які славіцца сваім мінімалістычным пейзажам. На жаль, хоць прадстаўленыя работы зусім новыя — «Зіма-II» і «Зіма-III» створаны ў 2022 годзе, матывы і вобразы ўжо добра знаёмыя дасведчанаму гледачу. Як і ў выпадку з Міхаілам Кротам — яго работы неаднойчы сустракаліся ў экспазіцыях апошняга часу. Між тым ніхто не абяцаў абсалютна новых уражанняў, размова менавіта пра стварэнне святочнай атмасферы. Дарэчы, цікавая гісторыя — назва прадстаўленага палатна Міхаіла Крота «На старой вуліцы» (2020) зведала пэўную мадэрнізацыю, верагодна, для таго, каб стаць часткай экспазіцыі. Насамрэч арыгінальнае найменне кардынальна мяняе справу: «Вясна на старой вуліцы».

Ратуюць сітуацыю лірычныя пейзажы, якія перадаюць і калючы мароз, і рыпучы снег, і цішыню зімовага вечара. Напрыклад, Наталля Камінская скарыстала праверaны сродак: для адчування гледачом такога надвор'я адлюстравала не толькі гурбы снегу, але і цёмную хацінку, якая яшчэ здалёк саграваe святлом з акенца. Назва палатна — «Там, дзе чакаюць» (2022). Асаблівым настроем прасякнуты і лаканічныя сюжэты некаторых іншых аўтараў: Наталлі Наўроцкай, Святланы Ярмак, Веранікі Віткоўскай і Веры Каўзановіч.

Як і заўжды, ствараюць казку такія аўтары, як Сяргей Пісарэнка і Тамара Дзяменцьева. Пры знаёмстве з іх творамі важныя не толькі мімалётныя асацыяцыі, але і шматзначныя сімвалы. Асабліва гэта тычыцца графікі другога майстра: яе «Батлейка» (2009) уражвае глыбінёй пранікнення ў традыцыйныя вобразы, кампазіцыйнай гармоніяй, прапрацаванасцю дэталей, вытанчанасцю ліній. Чорна-белая выява — выдатная ілюстрацыя таго, як можна знаёміць з тэмай і сімволікай батлейкі, як магчыма з дапамогай метафары гаварыць пра такі складаны сусвет.

Сяргей Пісарэнка «Гарадок», 2020 г.

Прывабліваюць і болей эксперыментальныя работы, сярод якіх — канцэптуальная кампазіцыя Сяргея Шылы «Сустрэча» (2012), выкананая з палатна і дрэва, і авангардны жывапіс Уладзіміра Акулава. Яго «Вечаровае падвор'е» (2016) напоўнена яркімі і выразнымі колерамі. Узнікаюць асацыяцыі і з паўночным ззянням, і з калейдаскопам, і з вітражом. У такой мазаіцы адшукваецца звычайны чалавек — ледзь не адзіны ў кантэксце гэтай выстаўкі. Ён прыхаваны сценамі сваёй крэпасці — невялічкага доміка — і назірае за навакольным светам з апаскай і надзеяй.

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара

Энігма мелодыі

У нас чамусьці прынята лічыць, што маладое пакаленне не зацікаўлена ў класічных элітарных відах мастацтва. Нібыта опера і, у меншай ступені, балет без новай генерацыі сыдуць у нябыт. Пагутарылі з маладымі выканаўцамі і кампазітарамі, студэнтамі Акадэміі музыкі, каб развеяць усе гэтыя міфы. Кірыл Кучынскі, Антон Карчэўскі і Антон Шукаў распавялі, як прыйшлі ў музыку, як на іх паўплывала опернае мастацтва і падзяліліся сваімі творчымі дасягненнямі і марамі.

Кірыл КУЧЫНСКІ

Пра шлях

Маю сям'ю можна назваць музыкальнай. Мая бабуля скончыла Магілёўскі каледж па спецыяльнасці рэжысёр і ўзначальвала Дом культуры ў маёй роднай вёсцы Падстарынь. Я з дзяцінства праводзіў час у яе на канцэртах, рэпетыцыях. На змену бабулі прыйшла мая маці. Спачатку яна працавала ў тым жа Доме культуры акампаніятарам, а цяпер кіруе ўстановай.

У 7 гадоў я ўпершыню выйшаў на сцэну. Помню, што канцэрт быў прысвечаны адкрыццю новага клуба. Папярэдні згарэў, таму было вырашана адкрыць новы. Калі я не памыляюся, то спяваў нешта з поп-музыкі. Напэўна, «Белые розы» Юрыя Шатунова.

Прыблізна ў той час мяне аддалі ў музычную школу. Услед за маці я скончыў яе па класе баяна. Вучоба была няпростая: ломка голасу ў падлеткавым узросце, іншыя секцыі накшталт футбола, ды больш хацелася спяваць.

Калі вучыўся ў сярэдняй школе, супрацоўнічаў з брэсцкім калектывам «*Brest Street Boys*». Доўга гэта не працягнулася, але тады я дакладна зразумеў, што трэба паспрабаваць сябе ў гэтым кірунку. Так, у апошні дзень падаў дакументы ў Мінскі каледж мастацтваў. Помню, што мне падавалася: усе спяваюць цудоўна, выразна і прафесійна. Не мог сябе ацаніць. А ў выніку з лёгкасцю паступіў на эстраднае аддзяленне.

Пра перашкоды

Усё ішло б цудоўна, калі б зімой на трэцім курсе мяне не адлічылі. Было асабліва крыўдна, што я адначасова і вінаваты, і не. Аднак ведаў, што ў каледж абавязкова вярнуся. У той перыяд давялося пабачыць жыццё ва ўсіх яго праявах. Працаваў на будаўніцтве, паспрабаваў сябе ў ролі ахоўніка, ды нават проста беспрацоўнага.

Восенню я аднавіўся ў каледжы, гэтым разам паспяхова скончыў. Стала відавочна, што варта працягваць музычную кар'еру. Толькі цяпер я зрабіў стаўку на акадэмічныя спевы. Абраў вакальна-харавы факультэт. Гэта былі новыя няпростыя прыгоды.

Калі няма сіл, то нават атмасфера акадэміі дае падтрымку. Напэўна, слушна назваць гэта духам, які сфарміраваўся за столькі гадоў. Немагчыма ўявіць, каб нехта не пайшоў на вучобу. Там і сцены, і фотаздымкі рэктараў нагадваюць аб дысцыпліне і адказнасці.

Пра оперу

Упершыню ў оперны тэатр я трапіў выпадкова. Сябры запрасілі на «Вяселле Фігара» В. А. Моцарта. Я прыйшоў, здаецца, без асаблівай цікавасці. Аднак з самых першых сцэн быў проста зачараваны. Тое, што я ўбачыў, абяззброіла. Дагэтуль мноства разоў у каледжы сутыкаўся з операй, аднак нават не ўяўляў, што адбываецца непасрэдна на спектаклях.

Пад уражаннем ад твора Моцарта зразумеў, што трэба змяніць кірунак. Я зараз на 3 курсе і адчуваю: не памыліўся. Тады ж вырашыў, што прыйдзе час і мне выступіць на сцэне Вялікага тэатра. Не мара. Мэта, для дасягнення якой неабходна прайсці шмат выпрабаванняў, мноству тэхнік навучыцца і перажыць не адзін адбор.

Я зразумеў, што мне даспадобы больш лёгкія камедыі. Такія як «Вяселле Фігара», «Севільскі цырульнік». Бо люблю жыць весела. Жартаўлівыя гісторыі прываблівающь больш. Калі опера можа падараваць мне эмоцыі, то лепш, каб яны былі станоўчыя. Асобна адзначаю для сябе «Пікавую даму» і «Травіяту».

У сваім падыходзе ўлічваю ўласныя магчымасці. Мне прасцей рассмяшыць чалавека, добра пажартаваць, стварыць весялосць. Таму і салістаў, майстроў гэтай справы, я ацэньваю асабліва высока.

Пра прафесію

З мінулага года працую ў Тэатры эстрады, і для мяне гэта незвычайны жыццёвы паварот. Пасля ўсяго, што было ў мінулым, падаецца, што ўсё атрымалася вельмі проста. Хоць і хваляваўся на першых спектаклях, аднак была ўпэўненасць: спраўлюся.

Мне цікава ўвасабляць новыя вобразы. Тут патрэбна працаваць не толькі над голасам, але і над артыстызмам. Сапраўдная школа жыцця. Ніякая тэорыя не дапаможа зразумець усе ўнутраныя працэсы на сцэне.

Упэўнены, што доўга яшчэ не змагу забыць свой першы спектакль. Усё прайшло добра, нават вельмі добра.

На маю думку, гэта неабходны пачатак.

Антон КАРЧЭЎСКІ

Пра ўплыў

Нішто ў дзяцінстве не прадракала, што ў 2023 годзе я буду студэнтам Акадэміі музыкі. Мае бацькі не звязаны з гэтым відам мастацтва. Бацька працаваў у міліцыі, маці змяніла некалькі прафесій.

З дзяцінства запомніў, як тата браў гітару і заўсёды забіраў на сябе ўсю ўвагу. У той час я і звярнуўся да бацькі з просьбай, каб ён навучыў і мяне.

У музычнай школе я вучыўся на харавым аддзяленні, але лепш запомніў, як выбіраў музычны інструмент. Мне падалося, што баян і скрыпка нязручныя, нават складаныя. Таму спыніўся на фартэпіяна, бо ў галаве з'явіўся малюнак класічнага кампазітара, які сядзіць за інструментам і складае новы твор. Так праз пэўны час і сталася. Пачаў ствараць і сам.

Пра перамены

Самы трывожны час майго навучання ў музычнай школе — ломка голасу. Не было ніякай гарантыі, што, калі гэты біялагічны працэс адбудзецца, я змагу спяваць. Толькі калі стала зразумела, што голас ёсць і барытон дастаткова акрэслены, змог абдумаць далейшыя планы.

Ні ў чым акрамя музыкі, не бачу сваёй рэалізацыі. Нічога так не лягло на сэрца. Тады было прынята рашэнне паступіць у Мінскі каледж мастацтваў. Яго дапамог выбраць тата. Пашчасціла, што ў сям'і ўсе сур'ёзна ўспрымалі мае заняткі музыкай і заўсёды падтрымлівалі.

Тады я нават падумаць не мог, што захачу калісьці стаць салістам оперы. Падчас паступлення здавалася, што акадэмічны вакал — добры інструмент для эстраднай кар'еры. Але за чатыры гады навучання разуменне, што класічная музыка мне бліжэйшая, замацавалася. Усё цяжэй і цяжэй уяўляць сябе ў межах эстраднага жанру.

Пра сачыненні

Музыка, на маю думку, — тое самае мастацтва, якое дапамагае развівацца нават разумова. Не стаяць на месцы. Стаміўся слухаць — іграй. Стаміўся выконваць — чытай пра кампазітараў. Стаміўся чытаць — стварай!

Першы раз пісаць сваё я паспрабаваў у 15 гадоў. Здаецца, гэта было вельмі кепска. Мой перфекцыянізм кажа, што нават зараз, праз 8 гадоў, не атрымліваецца. Магчыма гэта не супадае з рэчаіснасцю. Таму што калі я прынёс свае сачыненні выкладчыцы ў каледжы, атрымаў выключна станоўчую ацэнку. І на дзяржаўным экзамене выконваў сваю песню. А ў 2019 годзе на конкурсе «Маладыя таленты Беларусі» за выкананне маёй песні «Дзіўны сон» я атрымаў Гран-пры.

Пра хуткаплыннасць

Класічная музыка не для ўсіх. Не кожны можа прыйсці, сесці і праслухаць на працягу 3—4 гадзін мноства складаных, глыбокіх кампазіцый. А тым больш калі гэта ўсё аздоблена голасам мужчынскім ці жаночым. У свеце, дзе вельмі лёгка «заліпнуць» на кліпы па тры хвіліны, трэба мець сур'ёзныя падставы прыйсці на шматгадзінны канцэрт. Аднак варта заўважыць, што выраз «не кожны чалавек» ніяк не ўплывае на колькасць наведвальнікаў, напрыклад, нашага Вялікага тэатра.

Некалькі дзесяцігоддзяў таму гэта было больш проста і натуральна. Людзі мелі менш стрэсу. А акадэмічную музыку варта слухаць у стане расслабленасці і спакою. Прынята лічыць, што музыка павінна хутка, літаральна за тры хвіліны, даць чалавеку эмоцыю, а опера — не тое. У оперным мастацтве «хутка» — амаль заўсёды «кепска».

Яшчэ ёсць момант, што мноства людзей прыходзяць да асэнсавання оперы з узростам. Таму дзіўны дакор у бок моладзі. Нібыта ўсе сталыя людзі, якія зараз наведваюць Вялікі тэатр, у маладыя гады таксама хадзілі на оперу. Маладосць не заўсёды для гэтага. У такім узросце энергія і жывасць б'юць праз край. Ніякая опера не ўтрымае ўвагу. Мне пашчасціла, што я з дзяцінства ў музыцы, таму дастаткова проста ўспрымаю пастаноўкі. А калі чалавека ў дзяцінстве не прывялі, то ідэя паглядзець новую пастаноўку «Травіяты» можа і не прыйсці ў галаву.

Антон ШУКАЎ

Пра класіку

Музычнае дзяцінства ў мяне распачалося нават да таго, як пайшоў у звычайную школу. Мая сястра рыхтавалася да паступлення ў каледж музыказнаўства, таму павінна была слухаць шмат музыкі. У пачатку нулявых ўся класіка была на касетах. Я слухаў разам з ёй. Так пазнаёміўся з Моцартам, Бетховенам і прыйшоў у музычны свет, адкрыў яго.

У музычную школу прыйшоў у 9 гадоў. Стаў піяністам. Мне падабалася выконваць кампазіцыі на інструменце, але не менш цікавіла гісторыя музыкі. З вялікім задавальненнем чытаў пра кампазітараў, гісторыі стварэння твораў.

Хутка стала зразумела, што будзе і музычны каледж, і Акадэмія музыкі.

Пра авангард

Момант, калі ўсё змянілася, настаў у шостым класе музычнай школы, у 14 гадоў. Я пачуў твор польскага кампазітара Кшыштафа Пендэрэцкага «Плач па ахвярах Хірасімы». Гэта была авангардная рэч. З такім у музычнай школе не знаёмяць. Дагэтуль мне здавалася, што я проста піяніст, і абмяжоўваўся гэтым. Але маэстра Пендэрэцкі паказаў усе грані і рэальныя магчымасці музыкі.

Распачаліся мае эксперыменты і больш дасканалае вывучэнне свету музыкі. Стала зразумела, што ёсць інструменты па-за класікай, якія могуць ствараць такі яскравы музычны малюнак. І тады ж паўстала пытанне: чаму акадэмічная музыка да гэтага не звяртаецца?

Калі мы кажам пра Пендэрэцкага, які адкрыў мне свет авангарда, то самы моцны твор тут — «Страсці па Луку». Я набожны чалавек, і мяне заўсёды цікавіла літургічная музыка і кампазіцыі, якія суправаджаюць набажэнствы. Таму, пачынаючы з Гродзенскага музычнага каледжа, працаваў арганістам і ў Бернардынскім касцёле ў Гродне, і ў касцёле Святых Пятра і Паўла ў Іўі, і ў Марыінскім касцёле ў Мінску.

Пра беларускасць

На музычным конкурсе ў Самары быў прадстаўлены мой вакальны цыкл на вершы Алеся Разанава. Для мяне было істотна, каб са сцэны гучала беларуская мова. Па шчырасці, у Вялікім тэатры не хапае беларускай оперы, беларускіх балетаў. Зараз паказваюць толькі «Дзікае паляванне караля Стаха», а колькі скарбаў ляжыць на паліцах. Не сумняваюся, што гледачы пайшлі б на беларускія пастаноўкі.

Зараз у рэпертуары тэатра шмат італьянскіх спектакляў, аднак як музыкант і кампазітар разумею, наколькі беларускае выкананне адрозніваецца ад італьянскага.

Мяне цікавяць беларускія матывы. Іх вось якраз толькі беларусы па-сапраўднаму выканаць і могуць. Тут паўплывала і выхаванне, і веданне гісторыі. Не толькі паэты і кампазітары, але народнае мастацтва.

Пра мару

Я мару стаць прадукцыйным і запатрабаваным кампазітарам. А ў XXI стагоддзі гэта ажыццявіць асабліва складана. Калі пішаш музыку, трэба быць не проста таленавітым, але і вельмі актыўным. Гэта не заўсёды проста.

Не хачу быць Шубертам, які не чуў ніводнага свайго твора. Ім усё было напісана і пакладзена ў стол, а выконвалі гэта толькі пасля яго смерці. Хачу свае сачыненні пачуць.

Яна ЦЭГЛА

Пачынаючы ад самага заснавання «ЛіМа», нароўні з найлепшымі прадстаўнікамі творчай інтэлегенцыі, класікамі і лідарамі грамадскай думкі, на яго старонках публікаваліся таксама малавядомыя аўтары, якія толькі пачыналі свой творчы шлях. Так, газета адкрыла свету імёны многіх сёння прызнаных майстроў слова. У наш час, адшукваючы і публікуючы матэрыялы талентаў, мы працягваем гэтую слаўную традыцыю. Вашай увазе — тэксты па краязнаўчай тэматыцы юных дараванняў са сталічнай гімназіі № 174. Хто ведае, магчыма, менавіта гэтыя таленавітыя дзяўчаты ў хуткім часе і будуць вызначаць літаратурна-краязнаўчы ландшафт краіны.

Ад рэдакцыі

Памяць жыве ў сэрцы

Кім былі мае продкі? Упершыню я задалася гэтым пытаннем яшчэ ў маленстве, гасцяваўшы некалі ў бабулі ў вёсцы Лунін (Лунінецкі раён Брэсцкай вобласці). Бабуля — у той час настаўніца вясковай школы — на мае запыты прынесла тоўстую кнігу — альбом з фотаздымкамі. Гартаючы яго, я з захапленнем слухала расповеды. На адной са старонак на фота — чалавек з доўгімі вусамі, апрануты ў прыгожы пінжак. Гэта мой прапрадзед Канстанцін. Побач на развароце яго сын Міхаіл — мой прадзед…

Лізавета Жылач.

Канстанцін Палуян нарадзіўся на Палессі ў 1886 годзе ў сялянскай сям'і. Як вядома, пасля адмены прыгоннага права ў 1861-м сяляне яшчэ доўга марылі аб набыцці свайго надзела. Зямля і карміла, і апранала, і шчасце давала… Згадваюцца словы са знакамітай паэмы Якуба Коласа:

Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,
Каб з панскіх выпутацца пут,
І там зажыць сабе нанова:
Свая зямля — вось што аснова!

Каб ажыццявіць мару, мой прапрадзед вырашыў адправіцца ў ЗША — на заробкі. Вярнуўшыся праз пэўны час на Радзіму, купіў зямлю, коней, усе неабходныя прылады і пачаў гаспадарыць. Нарэшце мара спраўдзілася! І ўсё б нічога, ды сям'я ў Канстанціна з'явілася позна. Ажаніўся прапрадзед толькі ў 35 гадоў з прыгожай, працавітай і маладзейшай за яго Ганнай.

Мінула яшчэ колькі гадоў… Дзякуючы ўпартай працы, Канстанцін купіў два новыя дамы. А першы ахвяраваў царкве Барыса і Глеба. І сёння гэтая царква ўпрыгожвае Лунін. Прыходскія дакументы нават захавалі факт перадачы дома. У ім у свой час жыў святар са сваёй сям'ёй. Здавалася, што і далей усё будзе працягвацца так, але кола гісторыі вырашыла іначай…

Канстанцін Палуян.

Пачалася Другая сусветная вайна. Не абмінула гэтая падзея і сям'ю майго прапрадзеда Канстанціна. Ён трагічна загінуў на акупаванай тэрыторыі ў 1942 годзе. Пацярпелі таксама і радавая сядзіба, і гаспадарка. Вялікая сям'я — жонка і чацвёра дзяцей — засталася без кармільца.

Старэйшы сын — мой прадзед Міхаіл — нарадзіўся ў 1922 годзе ў Луніне. Скончыў восем класаў, марыў вучыцца далей, але вайна і смерць бацькі перашкодзілі: мусіў застацца з сям'ёй. У 1943 годзе Міхаіл быў мабілізаваны, трапіў мінамётчыкам на 1-ы Беларускі фронт.

Ваяваў мой прадзед самааддана, рызыкуючы жыццём: удзельнічаў у вызваленні Варшавы, уз'яднанні з саюзнікамі на Эльбе, згадваў жудасную бітву за Берлін. Яго заслугі былі адзначаны камандаваннем: у нашым сямейным архіве да гэтага часу захоўваюцца медалі і ордэны. Самыя значныя — медаль «За адвагу» і ордэн Чырвонай Зоркі. Звесткі пра баявыя заслугі Міхаіла Палуяна ёсць у электроннай базе даных «Подвиг народа».

Медаль «За адвагу» ён атрымаў пры прарыве абароны праціўніка паблізу вёскі Старое Радамскага ваяводства. 14 студзеня ён пад моцным артмінамётным агнём праціўніка паднёс 15 скрынь боепрыпасаў і зарадзіў 350 мін. У выніку хуткай стральбы знішчыў адзін станкавы кулямёт і 11 салдат праціўніка. Ордэнам Чырвонай Зоркі прадзед быў ушанаваны за подзвіг у наступальным баі 24 красавіка ў раёне Бад-Зароў (Германія, зямля Брандэнбург). Паставіўшы мінамёт на адкрытую пазіцыю, Міхаіл дзейнічаў рашуча і смела, трапным агнём знішчыў тры станкавыя кулямёты праціўніка і 12 гітлераўцаў, чым паспрыяў выкананню баявой задачы падраздзялення. 16 студзеня 1945 года Міхаілу Палуяну была аб'яўлена падзяка Вярхоўнага галоўнакамандуючага за ўдзел у прарыве абароны немцаў на заходнім беразе Віслы, за ўдзел у баях за Радам (горад у Польшчы).

Пасля заканчэння вайны прадзеду прапанавалі прадоўжыць службу ў Германіі. Але, як у свой час зрабіў і яго бацька Канстанцін, Міхаіл вярнуўся

Міхаіл Палуян.

на Радзіму. Прадзед удзельнічаў у аднаўленні разбуранай гаспадаркі. Тады ж у яго з'явілася сям'я. Са сваёй будучай жонкай ён сустрэўся яшчэ да вайны, а пасля яе заканчэння ў іх нарадзіліся дочкі Ніна і Таццяна — мае бабулі.

Менавіта ад іх праз гады, гартаючы сямейны альбом, я даведалася гісторыю майго роду. Існуе такое выслоўе: «У добрым родзе — усё ў згодзе». Дык гэта пра нас, пра наш вялікі дружны род, і я ганаруся сваімі продкамі. Памяць пра іх жыве ў сэрцах унукаў і праўнукаў.

Лізавета ЖЫЛАЧ,
выпускніца гімназіі № 174 г. Мінска

Нататкі вандроўніц

«А гэта — вандроўка праз сёлы, праз край мой шырокі, вясёлы…» — пісаў народны паэт Беларусі Максім Танк. Сённяшняя наша вандроўка таксама пралягае па родным краі, а менавіта — па завулках роднага мікрараёна. Разам з Ганнай Васільеўнай, нашай настаўніцай беларускай мовы і літаратуры, мы даўно марылі прагуляцца па ваколіцах любімай школы. Мікрараён наш распасцёрся на поўдні сталіцы. А якую прыгожую назву мае — Малінаўка!

Гэтым летам мы вырашылі пазнаёміцца з мікрараёнам бліжэй. Ранейшыя нашы пошукі і даследаванні падказалі: слова «малінаўка» мае розныя значэнні. Гэта можа быць як невялічкая светла-шэрая птушка, так і яблыня з ружаватымі кісла-салодкімі пладамі. Зрэшты, хутчэй за ўсё сваю назву мікрараён атрымаў ад суседняй вёскі Малінаўка.

Калі паглядзець на карту, увагу адразу прыцягвае вуліца Курганная ў прыватным сектары, зусім не падобная на іншыя. Яна знаходзіцца на ўскрайку мікрараёна. З аднаго боку да яе падступае горад, з другога — поле, невялікі лясны масіў і паркавая зона. Нам захацелася даведацца больш пра гэты куточак — вуліцу і тэрыторыю, якая да яе прылягае.

Іншыя падарожнічаюць транспартам: перамяшчаюцца на самалёце, караванамі альбо па вадзе. Наша ж вандроўка пешаходная (тры-чатыры кіламетры ходу).

Узяўшы планшэт, фотаапарат, нататнік, закінуўшы ваду і прыпасы ў заплечнік, рушылі. Некалькі хвілін шпацыру — і вось мы ўжо на пешаходным пераходзе да прыватнага сектара Дворышча. Шматпавярховы высокі дом на скрыжаванні вуліц Касманаўтаў і Курганнай, а далей, па абодва бакі апошняй, — аднапавярховыя дамы з уласнымі падворкамі.

З аднаго з такіх выйшла на вуліцу жанчына, звярнула на нас увагу. Валянціна Лявонцьеўна Міклашэвіч аказалася былой настаўніцай гісторыі! Яна распавяла, што назва прыватнага сектара Дворышча паходзіць ад агульнаславянскага слова двор, якое ў старажытнай індаеўрапейскай мове азначала «дзверы», «вароты».

Пачынаючы з X стагоддзя, у найбольш ранніх пісьмовых дакументах гэты тэрмін ужываўся ў розных значэннях. У старажытнасці двор быў вядомы як паселішча хутарскога тыпу. Сёння ж Дворышча як прыватны сектар мікрараёна часткова захаваў гістарычныя асаблівасці комплексу пабудоў.

Валянціна Лявонцьеўна параіла сустрэцца з яе суседкамі — мясцовымі старажыламі. Так да нас далучыліся Іна Іванаўна Тарасевіч і Аляксандра Сяргееўна Астроўская. Яны пагадзіліся стаць нашымі праваднікамі. Разам мы абышлі Дворышча з абодвух бакоў.

З аднаго боку, паміж вуліцамі Касманаўтаў і Курганнай, — незабудаваная тэрыторыя з невялікім лужком і кавалкам лесу. Гэта Матусевічаў выган і Алешнік. Пра паходжанне назваў сведчаць легенды і паданні, якія нам удалося запісаць ад сваіх экскурсаводаў.

У даваенныя часы тут стаяла некалькі хат, была ферма. Яе загадчыкам з'яўляўся чалавек па прозвішчы Матусевіч. Пазней ферму расфарміравалі і далучылі да суседняга новаўтворанага калгаса. Тады Матусевіч завёў сваю ўласную гаспадарку (некалькі кароў і коз) і пасвіў на вольным месцы, якое і пачалі называць Матусевічаў выган. У той жа час, стварыўшы калгас, людзі ўзяліся будаваць пасёлак. Дрэвы вазілі з альховага лесу, што раскінуўся недалёк, з іх і ўзводзілі дамы. Адсюль пайшла назва Алешнік.

На другім краі Дворышча знаходзіцца парк Паўлава, закладзены ў першай палове 1990-х гг. як частка водназялёнай сістэмы Мінска. Парк — упадабанае месца адпачынку жыхароў найбліжэйшых мінскіх мікрараёнаў і галоўная адкрытая святочная пляцоўка Маскоўскага раёна сталіцы. З бацькамі мы неаднойчы адпачывалі тут. Але сёння ў нас іншая мэта…

Мясцовыя жыхары называлі і называюць парк па-свойску — «Мухляй». Праз яго цэнтр працякае рака Лошыца, на рэчышчы якой створаны штучны вадаём і фантаны. Лошыца — гэта афіцыйная назва ракі. Мясцовыя ж клічуць яе Мышкай (Мухляй). Легенда даводзіць, нібыта раней на берагах яе было шмат мышыных нор. Вядома, як падыходзілі людзі,

Від на парк імя Міхаіла Паўлава.

мышы разбягаліся. Ды адна маленькая нікога не баялася і з месца не сыходзіла. Калі яна ўсё ж такі знікла, людзі вырашылі назваць рэчку ў яе гонар.

Але ёсць і іншае паданне. Паводле яго, даўным-даўно маленькую вёску, што месцілася на беразе безыменнай рэчкі, ледзь не знішчыў пажар. Людзі ў той час жылі адной вялікай сям'ёй. Вадой з рэчкі яны патушылі полымя. Талакой адбудавалі спаленую хату, а калі сабраліся ў ёй, убачылі маленькую мышку. Тады і вырашылі даць назву рэчцы.

У выніку нашай экспедыцыі высветлілася, што тут, каля гарадской мяжы, жыхары выкарыстоўваюць у паўсядзённым жыцці «мікратапонімы» — назвы малых мясцовых аб'ектаў. Напрыклад, Алешнік — лясок за паўтара кіламетра ад мікрараёна, Стары Двор — тэрыторыя былога гаспадарчага двара, дзе знаходзілася ферма, Матусевічаў выган — месца выпасу жывёлы, названае па прозвішчы аднаго з былых гаспадароў, Мухля — парк імя Міхаіла Паўлава, таксама Мухля — народная назва ракі Лошыцы.

Падзякаваўшы нашым спадарожніцам, мы, задаволеныя і стомленыя, накіраваліся дадому. Насамрэч, каштоўны матэрыял здабылі сёння. Легенды і паданні — гэта наша гісторыя, гісторыя роднага краю. Ды яны цікавыя не толькі ў гістарычным плане, але яшчэ і сваёй каларытнай мовай, займальным сюжэтам. Наша маленькая задума выросла ў сапраўднае падарожжа! Няхай яно было невялікае, але затое незабыўнае!

Вера АДАМУШКА і Анастасія ДАЛГАНАВА,
вучаніцы 7 «А» класа гімназіі № 174 г. Мінска

Кветка з літпалетка

Сэрца, у якім жывуць любоў і боль

Рэдакцыя «ЛіМа» рада прадставіць чытачу новую рубрыку — «Кветка з літпалетка», дзе мы пастараемся прасачыць, якія расліны трапляюць на дзялянку літаратурнай творчасці, чым яны зачароўваюць айчынных пісьменнікаў і якімі эпітэтамі і метафарамі творцы іх надзяляюць… Першая ў зялёным царстве, пра якую хочацца згадаць у чаканні цёплай вясны, — дыцэнтра, альбо, як яе называюць у народзе, — разбітае сэрца.

«Я прачнуўся ад нейкай трывогі і зразумеў: трэба на Беларусь. Сёння там зацвітаюць вішні і жывыя агароджы глогу ружовай сцяною ідуць паўз цябе», — пачынаў Уладзімір Караткевіч верш у прозе пад назвай «Разбітае сэрца». Подпіс пад творам сведчыць, што гэта адбылося ў красавіку 1956 года. У той час малады пісьменнік працаваў настаўнікам сярэдняй школы ў вёсцы Лесавічы Тарашчанскага раёна Кіеўскай вобласці, скончыўшы рускае аддзяленне філалагічнага факультэта Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі. Здаў кандыдацкі мінімум, пачаў пісаць дысертацыю пра паўстанне 1863 года ва ўсходнеславянскіх і польскай літаратурах. Відаць, па радзіме сумаваў моцна:

«Сёння там пеўні гукаюць вясну і, калі выходзіш у сад, блакітныя незабудкі ківаюць табе галавой.

Там, мусіць, вось-вось зацвіце ў кветніку «разбітае сэрца», простая кветка, якой я нідзе больш не бачыў, акрамя як на маёй зямлі.

“Разбітае сэрца”, паўкруг сцябла з нізкаю маленькіх ружовых сэрцаек, на кожным з якіх вісіць унізе белая кропля.

Пад кронамі дрэў, дзе мокры цень, цвіце яно і цягне, цягне да сябе й маё сэрца, у якім жыве любоў і боль.

Я нідзе больш не сустракаў цябе, маленькая кветка, і таму для мяне ты такі ж самы сімвал бацькаўшчыны, зямлі майго кахання і труны маіх дзядоў, як бусел, як зубр, як сінія вейкі пралескі-

Калаж Святланы Тарсонскай.

любкі — першай кветкі нашай вясны (тут першая кветка белая, быццам ніяк не можа забыць пра зіму)».

Верш гэты не ўвайшоў у зборнік «Матчына душа» (які паэт багата аздобіў шматлікімі раслінамі Бацькаўшчыны), што неўзабаве пабачыць свет, у 1958 г. і пры жыцці аўтара не друкаваўся. Толькі ў 1990 годзе выйшаў пад вокладкай часопіса «Маладосць», рукапіс твора захоўваецца ў Аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі.

«Я цягнуся да цябе, простая расліна нашых кветнікаў, жывая мая душа, сэрца маё.

І калі ціхім летнім світанкам з сэрцаек тваіх падаюць сцюдзёныя кроплі расы — я з сваёй далечыні адчуваю гэта так, як быццам яны падаюць з майго сэрца: такую ўразлівасць дае кожнаму сэрцу чалавечаму імкненне да лепшай, да любай, да самай прыгожай сваёй зямлі».

З аспірантурай у Караткевіча не атрымалася, кандыдацкую работу пра паўстанне ён не абараняў, дый не падобна, каб моцна аб тым шкадаваў: «… прыйшлі іншыя інтарэсы: з’явілася задумка аб рамане» (раман у дзвюх кнігах «Каласы пад сярпом тваім» выйдзе толькі ў 1968 годзе)…

Адпрацаваўшы два гады ў Лесавіцкай школе, пісьменнік вяртаецца на радзіму, у 1956—1958 гадах ён ужо настаўнік 8-й сярэдняй школы ў Оршы. Поўны творчых задум, малады, да ўсяго цікаўны, няўрымслівы, і напарадзе — усё жыццё… І спрэс у ім — кветкі Бацькаўшчыны…

Што тычыцца «разбітага сэрца», лацінская назва якога «*Dicentra*», то У. Караткевіч трапна заўважыў, што цвіце кветка «пад кронамі дрэў, дзе мокры цень». Кусцікі «разбітага сэрца» лепш развіваюцца і больш пышна цвітуць у паўзацененых месцах на лёгкіх, багатых перагноем глебах. Найчасцей у нас сустракаюцца ружовыя «сэрцайкі», але існуюць і іншыя, менш распаўсюджаныя разнавіднасці: белая, чырвоная і нават жоўтая.

«Разбітае сэрца» належыць да сямейства дымніцавых — у гэтых раслін кветкі сабраны ў гронкавыя суквецці, дробна рассечанае лісце і клубневае карэнне. Непатрабавальная ў плане догляду, марозаўстойлівая шматгадовая травяністая расліна. У родзе вядома каля 20 іх відаў, пашыраных ва Усходняй Азіі і Паўднёвай Амерыцы. Растуць некалькі відаў і ў сталічным Батанічным садзе. Размнажаюцца яны дзяленнем куста і насеннем, а таксама чаранкамі, што, аднак, патрабуе асаблівага клопату.

«Кветкі памятаюць нешта сваё, вельмі добрае. Нездарма яны так радасна ўсміхаюцца летнімі ранкамі, сустракаючы сонца», — пісаў У. Караткевіч у вершы «Кветкі». Пра што расказала б нам «разбітае сэрца», калі б мы маглі разумець мову раслін? Можа быць, пра глыбіні пяшчоты, якою поўніцца закаханае без спадзявання на ўзаемнасць сэрца? Пра карункі настальгіі, якімі ахутаны душы пілігрымаў?..

Таша ШПАКОЎСКАЯ

зваротная сувязь

Казкі старога дома

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя праекты. Згодна з абноўленым раскладам, пачуць вершы беларускіх аўтараў у праекце «Адным штрыхом» можна тройчы на дзень. Раніцай і вечарам у праграме «Радыёсерыял» гучыць дэтэктыў Агаты Крысці «Трэцяя дзяўчына».

Праграма «Літаратурная анталогія» гэтым разам прапануе апавяданні айчынных аўтараў. У «Радыёбібліятэцы» таксама тройчы на дзень слухайце твор Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, альбо Беларусь у фантастычных апавяданнях». Суботнім вечарам выходзіць перадача «Літаратурныя гісторыі», дзе 14 студзеня прагучыць першая частка аповесці «Подых пяшчоты» Навума Гальпяровіча (да 75-годдзя пісьменніка). Пад знакам юбілею вершы Навума Якаўлевіча ў аўтарскім выкананні слухайце ў перадачы «Прачулым радком» у суботу і нядзелю.

Змест перадачы «Радыётэатр плюс» вечарам у суботу складзе радыёпастаноўка паводле арабскіх казак «У навагоднюю ноч», у нядзелю ўвазе слухачоў — спектакль «Месяц межань» паводле аднайменнай аповесці Яўгена Радкевіча.

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе з панядзелка да пятніцы чытанні ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». У суботу ў перадачы «Дзіцячы радыётэатр» выйдзе пастаноўка «Навагодні дэтэктыў» паводле Пятра Васючэнкі. У нядзелю слухайце «Папялушку» Шарля Перо і «Казку старога дома» Дональда Бісета. Штовечар у 21.00 для маленькіх гучыць «Вячэрняя казка».

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ». У нядзелю радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» пісьменніка, публіцыста Навума Гальпяровіча прапануе сустрэчу з намеснікам дырэктара Мінскага абласнога ліцэя Валянцінай Скібай. Новы выпуск праекта гэтага аўтара «Літаратура на радыё» прагучыць у чацвер.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by і* ў сацыяльных сетках.

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

17 студзеня — у публічную бібліятэку № 7 (вул. Пляханава, 97/4) на творчую сустрэчу з празаікам Сяргеем Трахімёнкам. Пачатак у 17.00.

18 студзеня — у бібліятэку № 8 імя Максіма Багдановіча (вул. Казлова, 12) на творчую сустрэчу з паэтам Уладзімірам Мазго «Жыццё, прысвечанае кнізе». Пачатак у 12.00.

19 студзеня — на юбілейны творчы вечар Міколы Чарняўскага, які пройдзе ў Доме літаратара (вул. Фрунзэ, 5). Пачатак у 17.00.

ЛіМ КАЛЯНДАР

16 студзеня 80-гадовы юбілей святкуе Мікола Чарняўскі (1943), беларускі паэт, празаік, перакладчык, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь.

19 студзеня 85-годдзе адзначае Валянціна Свентахоўская (1938), беларускі жывапісец.

20 студзеня — 115 гадоў з дня нараджэння Івана Рудчыка (1908—2000), беларускага жывапісца.

20 студзеня — 75 гадоў з дня нараджэння Вячаслава Жыбуля (1948—1996), беларускага крытыка, літаратуразнаўца.

21 студзеня — 100 гадоў з дня нараджэння Аркадзя Астрамецкага (1923—2002), беларускага цымбаліста, педагога, народнага артыста Беларусі.

21 студзеня — 95 гадоў з дня нараджэння Івана Аношкіна (1928—2013), беларускага празаіка.

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ выказваюць глыбокае спачуванне Раісе Раманчук з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — трагічнай смерці СЫНА.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб’яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі;
прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк
12.01.2023 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 857

Друкарня Рэспубліканская ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013
Заказ — 47
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 23002